**№ 155.** 15 траўня 1863 г. — Рапарт памочніка чэрыкаўскага павятовага спраўніка Е.В. Вярбіцкага магілёўскаму цывільнаму губернатару А.П. Беклямішаву аб адсутнасці паўстанцаў у павеце......341

**Мінская губерня**

**№ 156.** 11 чэрвеня 1863 г. — Загад камандуючага войскамі Віленскай вайсковай акругі М.М. Мураўёва камандуючаму войскамі ў Мінскай губ. В.І. Забалоцкаму аб неабходнасці актыўных дзеянняў пры сутыкненні з паўстанцкімі атрадамі і адказнасці атрадных начальнікаў за нерашучасць......342

**№ 157.** Чэрвень 1863 г., г. Мінск. — Цыркуляр мінскага цывільнага губернатара А.Л. Кажэўнікава ваенна-павятовым начальнікам Мінскай губ. аб увядзенні медалёў для ўзнагароджвання ніжніх ваенных чыноў і сялян і дастаўцы звестак пра тых, хто гэтага заслугоўваў. ......343

**№ 158.** 7 ліпеня 1863 г. — Выпіска з загаду віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва часоваму ваеннаму губернатару Мінскай губ. В.І. Забалоцкаму аб падзяцы сялянскім таварыствам за дапамогу ў падаўленні паўстання і ўвядзенні грашовага ўзнагароджвання для сялян за паланенне паўстанцаў......343

**№ 159.** 17 ліпеня 1863 г. — Распараджэнне камандуючага войскамі Віленскай вайсковай акругі М.М. Мураўёва камандуючаму войскамі Мінскай губ. В.І. Забалоцкаму аб змяненні тактыкі ваенных дзеянняў супраць паўстанцкіх атрадаў у сувязі з аслабленнем паўстання......344

**№ 160.** 8 жніўня 1863 г., г. Мінск. — Распараджэнне часовага камандуючага войскамі Мінскай губ. В.І. Забалоцкага ваенным начальнікам паветаў і

камандзірам палкоў, што знаходзяцца ў Мінскай губ., аб падтрыманні пастаяннай гатоўнасці войскаў і абавязковых захадах па захаванні ваеннай тайны пры выступленні на баявыя аперацыі. ........................................................ 345

**№ 161.** 12 красавіка 1864 г. — Канфірмацыя М.М. Мураўёва пастановы Часовага палявога аўдытарыята ў г. Вільні аб прысуджэнні да смяротнага пакарання з канфіскацыяй маёмасці камісара Мінскага ваяв. дваранiна Мінскай губ. вольнапрактыкуючага доктара Міхала Аскеркі. ............................. 346

**№ 162.** 20 сакавіка 1864 г. — Цыркуляр віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва часоваму ваеннаму начальніку Мінскай губ. генерал-лейтэнанту В.І. Забалоцкаму аб правядзенні агляду лясоў для вышуку паўстанцаў і схаванай зброі. ....................................................................... 352

**БАБРУЙСКІ ПАВЕТ**

**№ 163.** 6 сакавіка 1863 г., г. Слуцк. — Рапарт ваеннага начальніка Слуцкага пав. палкоўніка Астахава мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб арышце западозранага ў падрыхтоўцы паўстання пісара Сорагаўскага сельскага таварыства Бабруйскага пав. Юстына Корбута. ....................................................................................... 354

**№ 164.** 1 чэрвеня 1864 г., г. Мінск. — Паведамленне часовага ваеннага губернатара Мінскай губ. В.І. Забалоцкага мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб аддачы пад паліцэйскі нагляд дваранак Бабруйскага пав. Паўліны і Юзэфы Нарэвіл за захоўванне вершаў «падбухторвальнага зместу». ........................................................................ 355

**№ 165.** 30 верасня 1874 г., г. Мінск. — Запыт 3 аддзялення Мінскага губернскага праўлення ва Упраўленне дзяржаўных маёмасцяў Мінскай губ. аб перашкодах да вызвалення ад забароны маёнтка Вязаўка Бабруйскага пав., частка якога падлягала канфіскацыі за ўдзел у паўстанні яго ўладальнікаў Генрыка і Пятра Есьманаў. ............................................................ 355

**БАРЫСАЎСКІ ПАВЕТ**

**№ 166.** 9 лютага 1863 г., м. Лагойск Барысаўскага пав. — Ліст прыстава 2 стану Барысаўскага пав. А. Ляцкага невядомай асобе аб напружанай сітуацыі ў Барысаўскім пав. і падазрэннях у падрыхтоўцы да паўстання некаторых асоб. ......................................................................................... 358

**№ 167.** 18 лютага 1863 г., м. Лагойск Барысаўскага пав. — Рапарт прыстава 2 стану Барысаўскага пав. А. Ляцкага мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб праведзеных у павеце арыштах асоб западозраных у падрыхтоўцы да паўстання. ....................................................................... 362

**№ 168.** 5 траўня 1863 г., м. Лагойск Барысаўскага пав. — Рапарт прыстава 2 стану Барысаўскага пав. А. Ляцкага мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву з дадаткам паказанняў яўрэя Лейбы Зіскіна аб чытанні дваранінам Канстанцінам Яноўскім газеты «Мужыцкая праўда». ....................... 366

**№ 169.** 22 красавіка 1863 г. — Паказанні вазніцы Міхала Жабінскага барысаўскаму земскаму спраўніку П.М. Дамухоўскаму пра збор атрада

паўстанцаў у фальв. Дамашкавічы Барысаўскага пав. пад кіраўніцтвам штабс-капітана Мельхіёра Чыжыка. ....368

**№ 170.** 23 красавіка 1863 г. — Рапарт барысаўскага земскага спраўніка П.М. Дамухоўскага мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб з’яўленні ў павеце атрадаў паўстанцаў. ....371

**№ 171.** 23 красавіка 1863 г. — Рапарт барысаўскага земскага спраўніка П.М. Дамухоўскага мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб дзеяннях паўстанцаў у Барысаўскім павеце 19–22 красавіка 1863 г. ....375

**№ 172.** 22 красавіка 1863 г., м. Лагойск Барысаўскага пав. — Рапарт прыстава 2 стану Барысаўскага пав. А. Ляцкага мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб руху паўстанцаў у павеце і праведзеных арыштах. ....378

**№ 173.** 24 сакавіка 1863 г., г. Барысаў. — Рапарт барысаўскага гараднічага А. Пякарскага мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб фарміраванні паўстанцкага атрада ля м. Докшыцы Барысаўскага пав. і аб зробленых захадах у г. Барысаве для прадухілення яго захопу паўстанцамі. ....381

**№ 174.** 10 траўня 1863 г., г. Барысаў. — Рапарт барысаўскага гараднічага А. Пякарскага мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб сустрэчы палонных паўстанцаў у г. Барысаве. ....382

**№ 175.** 18 траўня 1863 г. — Рапарт барысаўскага павятовага спраўніка маёра А. Варанца мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб разгроме паўстанцкага атрада Генрыка Дмахоўскага і паланенні некаторых асоб з яго. ....383

**№ 176.** 19 верасня 1863 г. — Рапарт в.а. судовага следчага засядальніка Барысаўскага земскага суда Г.К. Уронскага мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб забойстве прыстава 2 стану Барысаўскага пав. А. Ляцкага. ....385

**№ 177.** 13 верасня 1863 г. — Акт допыту двараніна Дзісенскага пав. Зянона Пятроўскага аб знаходжанні ў складзе паўстанцкага атрада Генрыка Дмахоўскага. ....386

**№ 178.** 20 верасня 1863 г. — Рапарт часовага ваеннага губернатара Мінскай губ. В.І. Забалоцкага віленскаму генерал-губернатару М.М. Мураўёву аб захадах па рэпрэсіях супраць насельніцтва Барысаўскага пав. у сувязі з забойствам прыстава 2 стану Барысаўскага пав. А. Ляцкага. ....388

**№ 179.** 12 снежня 1863 г., г. Барысаў. — Паведамленне ваеннага начальніка Барысаўскага пав. палкоўніка Дамброўскага Аршанскай следчай камісіі аб сутычках рас. войскаў з паўстанцамі ў Барысаўскім пав. ....389

**№ 180.** 13 ліпеня 1864 г. — Канфірмацыя камандуючага войскамі Віленскай вайсковай акругі М.М. Мураўёва ад 13.07.1864 пастановы Часовага палявога аўдытарыята ад 07.07.1864 па справе селяніна Лепельскага пав. Марціна Заянчкоўскага, які ўваходзіў у склад сфарміраванага ў м. Валосавічы Барысаўскага пав. паўстанцкага атрада пад кіраўніцтвам двараніна Кучэўскага. ....390

## Ігуменскі павет

**№ 181.** 18 лютага 1863 г. — Рапарт магілёўскага земскага спраўніка У.М. Блахіна магілёўскаму цывільнаму губернатару А.П. Беклямішаву аб гатоўнасці да паўстання насельніцтва ў Барысаўскім і Ігуменскім паветах з прапановамі па недапушчэнні распаўсюджвання паўстання ў Магілёўскі пав. ........ 392

**№ 182.** 1 траўня 1863 г. — Рапарт прыстава 2 стану Ігуменскага пав. Т.К. Беліновіча мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб дзейнасці паўстанцаў у павеце і дзеяннях супраць іх расійскіх войскаў........ 394

**№ 183.** 24 траўня 1863 г. — Паказанні селяніна фальварка Навасёлкі Ігуменскага пав. Рыгора Андросіка, дадзеныя ў канцылярыі мінскага цывільнага губернатара, аб спробе навасёлкаўскіх сялян затрымаць паўстанцкі атрад 21 красавіка 1863 г. і забітых і параненых пры гэтым. ........ 395

**№ 184.** 21 чэрвеня 1863 г. — Рапарт ігуменскага павятовага спраўніка маёра Кастагорава мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб перамозе ў чэрвені 1863 г. ля вак. Перуноў Мост Ігуменскага пав. над паўстанцкім атрадам Баляслава Свентарэцкага, паланенні Гектара Карказевіча і іншых паўстанцаў і пераследванні расійскімі войскамі рэштказ атрада ў Ігуменскім пав., а таксама пра колькасць паўстанцаў, зняволеных у г. Ігумене і адпраўленых з г. Ігумена ў г. Мінск. ........ 396

**№ 185.** 25 кастрычніка 1863 г., г. Мінск. — Паведамленне часовага ваеннага губернатара Мінскай губ. В.І. Забалоцкага ваеннаму начальніку Пінскага пав. аб арышце ў вак. Французская Грэбля Ігуменскага пав. 10 паўстанцаў з атрада Станіслава Ляскоўскага з загадам не дапусціць праходу атрада па Пінскім пав. ........ 397

**№ 186.** 6 лістапада 1863 г., г. Орша. — Рапарт Аршанскай следчай камісіі магілёўскаму цывільнаму губернатару А.П. Беклямішаву аб паказаннях вучня Мінскай гімназіі Юзафа Дышлеўскага пра дзейнасць паўстанцкага атрада Баляслава Свентарэцкага ў Ігуменскім пав. ........ 398

## Мазырскі павет

**№ 187.** 23 студзеня 1863 г., г. Мазыр. — Ліст вучняў Мазырскай гімназіі Людвіка Сакалоўскага і Станіслава Галіцкага двараніну Мінскага пав. Адольфу Міркулевічу са спісам асоб з Рэчыцкага і Мазырскага паветаў і выказваннем спадзяванняў на хуткае паўстанне. ........ 400

Пераклад ........ 401

**№ 188.** 13 красавіка 1863 г., г. Мазыр. — Паведамленне дырэктара Мазырскай гімназіі Шульгіна ваеннаму начальніку Мазырскага пав. палкоўніку Чакмарову аб непарадках, што адбываліся ў Мазыры, з паказаннем сведкаў, якія могуць гэта пацвердзіць. ........ 402

**№ 189.** 12 верасня 1863 г. — Рапарт часовага ваеннага губернатара Мінскай губ. В.І. Забалоцкага віленскаму генерал-губернатару М.М. Мураўёву аб

захадах, зробленых у Мазырскім пав. для прадухілення паўстання, і пакаранні асоб, западозраных у спачуванні паўстанцам. ....................................404

**№ 190.** 25 верасня 1863 г., г. Вільня. — Загад камандуючага войскамі Віленскай вайсковай акругі М.М. Мураўёва часоваму ваеннаму начальніку Мінскай губ. В.І. Забалоцкаму аб выкананні канфірмацыі па справе селяніна Мазырскага пав. Каятана Грыцэнкі, прызнанага вінаватым у хаванні зброі. .......406

**Мінскі павет**

**№ 191.** 2 чэрвеня 1863 г., м. Ракаў Мінскага пав. — Рапарт ваеннага начальніка 2 стану Мінскага пав. паручніка Кавалеўскага ваеннаму начальніку Мінскага пав. палкоўніку Воранаву аб асобах са стану, якія прынялі ўдзел у паўстанні. ..........................................................................................408

**№ 192.** 25 ліпеня 1863 г., г. Мінск. — Загад ваеннага начальніка Мінскага пав. палкоўніка Карэвы ваеннаму начальніку 3 стану гэтага ж павета аб неабходнасці прадухілення магчымых палітычных маніфестацый 31.07.1863 – у дзень аб'яднання Літвы з Польшчай. ..............................................................410

**№ 193.** 25 кастрычніка 1863 г., г. Мінск. — Загад ваеннага начальніка Мінскага пав. палкоўніка Карэвы ваеннаму начальніку 3 стану гэтага ж павета аб парадку высялення лясной варты, вобысках у касцёлах, манастырах і дамах ксяндзоў і аб пошуку схаванай зброі. ....................................410

**№ 194.** 1863–1864 гг., г. Мінск. — Ліст двараніна Мінскага пав. Юзафа Міркулевіча да брата Адольфа аб сустрэчы зняволеных паўстанцаў у Мінску і затрыманні тых, хто іх сустракаў. ...........................................................411

Пераклад ....................................................................................................................411

**№ 195.** 21 чэрвеня 1864 г. — Рапарт міравога пасрэдніка 3 участка Мінскага пав. графа Э.А. Равускага часоваму ваеннаму губернатару Мінскай губ. В.І. Забалоцкаму аб п'янстве, рабаванні і злачынствах 16 чэрвеня 1864 г. жаўнераў Каломенскага пяхотнага палка і ваеннага начальніка 3 стану Мінскага пав. паручніка Астаф'ева падчас правядзення вобыскаў у маёнтку Ловішча Мінскага пав. ........................................................................................413

**№ 196.** 8 ліпеня 1864 г., г. Вільня. — Загад віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб закрыцці землямерна-таксатарскіх класаў пры Мінскай гімназіі з прычыны «шкоднага накірунку» яе выхавнцаў мясцовага паходжання. ..............................414

**Навагрудскі павет**

**№ 197.** 10 красавіка 1863 г., м. Нясвіж Слуцкага пав. — Рапарт слуцкага земскага спраўніка І.Я. Скродскага мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб руху паўстанцкіх атрадаў у Навагрудскім пав. і дзейнасці супраць іх расійскіх войскаў. ..................................................................415

**№ 198.** 12 красавіка 1863 г., г. Мінск. — Рапарт мінскага цывільнага губернатара А.Л. Кажэўнікава віленскаму генерал-губернатару У.І. Назімаву аб перамозе над паўстанцкім атрадам пад камандаваннем

Адама Пуслоўскага і Феліцыяна Лашкевіча 07.04.1863 ля м. Налібокі Ашмянскага пав. ........................................................................................ 417

**№ 199.** 20 красавіка 1863 г., г. Навагрудак. — Рапарт ваеннага начальніка Навагрудскага пав. палкоўніка А.А. Чартова камандзіру 3 Пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнанту А.Ф. Гальгоеру аб заснаванні Навагрудскай следчай камісіі і са спісам паўстанцаў з атрада Адама Пуслоўскага і Феліцыяна Лашкевіча, узятых у палон 07.04.1863 у баі ля м. Налібокі Ашмянскага пав. ..... 420

**№ 200.** 5 чэрвеня 1863 г., г. Вільня. — Загад камандуючага штаба войскаў Віленскай вайсковай акругі М.М. Мураўёва мінскаму ваеннаму губернатару В.І. Забалоцкаму аб расстрэле Адама Пуслоўскага. .............................................. 422

**№ 201.** 6 ліпеня 1863 г. — Рапарт навагрудскага павятовага спраўніка Масіна мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб спагнанні штрафу з жыхарак г. Навагрудка за нашэнне жалобнага адзення. ........................ 424

**№ 202.** Паміж 17 верасня і 16 кастрычніка 1863 г. — Заключэнне Мінскай следчай камісіі, пададзенае мінскаму цывільнаму губернатару, па справе аднадворца Францішка Трыбухоўскага, абвінавачанага ў агітацыі сялян в. Зазер'е Навагрудскага пав. удзельнічаць у паўстанні. ...................................... 425

**№ 203.** 21 снежня 1863 г., г. Вільня. — Паведамленне Віленскай следчай камісіі Мінскай следчай камісіі з вытрымкай з паказанняў двараніна Эдварда Доўнар-Запольскага пра дзейнасць паўстанцкага атрада Феліцыяна Лашкевіча, Уладзіслава Валодзькі і Вітальда Міладоўскага ў Навагрудскім і Слонімскім паветах. ..................................................................................... 427

**ПІНСКІ ПАВЕТ**

**№ 204.** Люты 1863 г., г. Мінск. — Тэлеграма мінскага цывільнага губернатара А.Л. Кажэўнікава магілёўскаму цывільнаму губернатару А.П. Беклямішаву аб з'яўленні паўстанцаў у Пінскім пав. і арыштах падазроных у Барысаўскім і Ігуменскім паветах. .................................................. 431

**№ 205.** 17 чэрвеня 1863 г., м. Рэчыца Пінскага пав. — Рапарт камандзіра атрада Палтаўскага рэзервовага пяхотнага палка паручніка Пятроўскага камандзіру гэтэга ж палка аб сутычцы з паўстанцкім атрадам Рамуальда Траўгута ў Альтанаўскай пушчы Валынскай губ. ля мяжы з Пінскім пав. .......... 432

**№ 206.** 19 чэрвеня 1863 г., м. Столін Пінскага пав. — Рапарт камандзіра атрада жаўнераў Палтаўскага рэзервовага пяхотнага палка падпалкоўніка Пляшкова камандзіру гэтага ж палка і ваеннаму начальніку Пінскага пав. аб сутычцы з паўстанцкім атрадам Рамуальда Траўгута ля м. Столін Пінскага пав. ............................................................................................................ 433

**№ 207.** 19 чэрвеня 1863 г., в. Радчыцк Пінскага пав. — Рапарт камандзіра атрада Палтаўскага рэзервовага пяхотнага палка маёра Семіганоўскага камандзіру гэтага ж палка аб сутычцы з паўстанцкім атрадам Рамуальда Траўгута ля мызы Калоднае Пінскага пав. ........................................................... 434

**№ 208.** 22 чэрвеня 1863 г., г. Кобрын. — Паведамленне камандуючага войскамі паўднёвай часткі Гродзенскай губ. генерал-маёра А.Ф. Эгера

ваеннаму начальніку Пінскага пав. палкоўніку Вярхоўскаму аб дзейнасці паўстанцкага атрада на мяжы Гродзенскай і Валынскай губ. і перасоўванні яго ў Пінскі пав....435

**№ 209.** 21 чэрвеня 1863 г., в. Жытнавічы Пінскага пав. — Рапарт камандуючага атрадам жаўнераў Пскоўскага пяхотнага палка генерал-фельдмаршала князя Кутузава-Смаленскага палка маёра фон Кека ваеннаму начальніку Пінскага пав. палкоўніку Вярхоўскаму аб сутычцы з паўстанцамі ля в. Жытнавічы Пінскага пав. ....436

**№ 210.** 22 чэрвеня 1863 г. — Данясенне арандатара фальв. Сенчыцы Пінскага пав. Антонія Кандратавіча Лявіцкага ваеннаму начальніку Пінскага пав. палкоўніку Вярхоўскаму аб знаходжанні паўстанцкага атрада ў Сенчыцах. ....437

**№ 211.** 28 чэрвеня 1863 г., г. Кобрын. — Паведамленне камандуючага войскамі паўднёвай часткі Гродзенскай губ. генерал-маёра А.Ф. Эгера ваеннаму начальніку Пінскага пав. аб дзеяннях падначаленых яму войскаў супраць атрада Казіміра Нарбута на памежжы Гродзенскай і Валынскай губерняў і Пінскага пав....438

**№ 212.** 3 жніўня 1863 г., пазіцыя Залессе ля в. Аброўская Вулька Слонімскага пав. — Рапарт падпаручніка Гарбатоўскага ваеннаму начальніку Пінскага пав. аб праследаванні атрада паўстанцаў і сутычцы з ім ля в. Аброўская Вулька на мяжы Слонімскага і Пінскага паветаў....439

**№ 213.** 6 кастрычніка 1863 г. — Даклад Мінскай следчай камісіі мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву з пераказам паказанняў удзельніка паўстання двараніна Гродзенскай губ. Міхала Палькоўскага аб дзейнасці ў красавіку–траўні 1863 г. атрада паўстанцаў у Слонімскім і Пінскім паветах і з рэзалюцыяй па яго справе....440

**Рэчыцкі павет**

**№ 214.** 11 сакавіка 1863 г., маёнтак Клёсін Рэчыцкага пав. — Рапарт рэчыцкага земскага спраўніка І.Т. Бародзіча мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб праведзеных арыштах у Рэчыцкім пав. двараніна г. Мазыра Антонія Шпігановіча, былога студэнта Кіеўскага ўніверсітэта Тадэвуша Арахоўскага і іншых асоб, западозраных ва ўдзеле ў паўстанні. ....442

**№ 215.** 4 сакавіка 1864 г., г. Мазыр. — Рапарт ваеннага начальніка Мазырскага і Рэчыцкага паветаў палкоўніка Чакмарова часоваму ваеннаму губернатару Мінскай губ. В.І. Забалоцкаму аб праведзеных у Мазырскім і Рэчыцкім паветах арыштах асоб, западозраных у падтрымцы паўстання. ....445

**№ 216.** 19 студзеня 1866 г., г. Вільня. — Канфірмацыя віленскага генерал-губернатара К.П. фон Каўфмана ад 19.01.1866 пастановы Часовага палявога аўдытарыята ў г. Вільні ад 15.01.1866 па справе асоб, якія абвінавачваліся ў падтрымцы паўстання ў Рэчыцкім і Мазырскім паветах. ....446

**Слуцкі павет**


**№ 217.** 25 красавіка 1863 г., г. Слуцк. — Рапарт ваеннага начальніка Слуцкага пав. палкоўніка Астахава мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб разгроме рас. войскамі 21.04.1863 ля в. Азярцы Ігуменскага пав. слуцкага паўстанцкага атрада пад камандаваннем Уладзіслава Машэўскага і Бранілава Вэндарфа з імянным спісам узятых у палон паўстанцаў. ..... 454

**№ 218.** 3 кастрычніка 1863 г., г. Слуцк. — Загад ваеннага начальніка Слуцкага пав. палкоўніка Астахава ваеннаму начальніку 3 стану Слуцкага пав. аб правядзенні валасных і сельскіх сходаў для прыняцця пастаноў пра ўтрыманне сельскіх узброеных варт за кошт сялян. ..... 460

**№ 219.** 20 студзеня 1864 г., г. Слуцк. — Загад камандзіра 31 пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнанта М.А. Ведэрмейера начальніку гэтага ж штаба падпалкоўніку Шнітнікаву аб правядзенні следства аб прамаўленні ў Слуцкім касцёле «падбухторвальнага» казання, самагубстве інжынер-капітана Уладзіслава Румэля і іншых справах у Слуцкім пав. ..... 461

**№ 220.** 18 лютага 1864 г., г. Мінск. — Паведамленне часовага ваеннага губернатара Мінскай губ. В.І. Забалоцкага мінскаму цывільнаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб перадачы на яго вырашэнне справы наглядчыка Слуцкага турэмнага замка, абвінавачанага ў неналежным выкананні службовых абавязкаў, што прывяло да самагубства ўдзельніка паўстання інжынер-капітана Уладзіслава Румэля. ..... 463

**№ 221.** 12 чэрвеня 1864 г., г. Мінск. — Паведамленне часовага ваеннага губернатара Мінскай губ. В.І. Забалоцкага в.а. мінскага цывільнага губернатара П.Н. Шаўгунову аб прысудзе былога засядальніка Слуцкага павятовага суда Мечыслава Ляткоўскага да ссылкі ў Казанскую губ. ..... 463

**№ 222.** 14 чэрвеня 1864 г., г. Мінск. — Даклад Мінскай следчай камісіі мінскаму цывільнаму губернатару П.Н. Шаўгунову аб палітычнай нядобранадзейнасці ксяндза Слуцкага касцёла Феліцыяна Гарбачэўскага. ..... 465

**№ 223.** 5 жніўня 1876 г., г. Мінск. — Прашэнне ўдзельніка паўстання двараніна Слуцкага пав. Ежы-Паўла Магільніцкага мінскаму губернатару В.І. Чарыкаву аб высылцы ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход паведамлення аб вяртанні яму правоў дваранства. ..... 468

**Асабовы паказальнік** ..... 470

**Геаграфічны паказальнік** ..... 491

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры** ..... 521

# ПРАДМОВА

Паўстанне 1863–1864 гг., якое ў гістарыяграфіі атрымала назву «студзеньскае» (ад месяца яго пачатку), з'яўляецца адной з найбольш маштабных падзей гісторыі зямель былой Рэчы Паспалітай увогуле і беларускіх тэрыторый у прыватнасці, перыяду іх уваходжання ў склад Расійскай імперыі. Яно закранула ўсе сацыяльныя слаі насельніцтва Беларусі і ў значнай ступені паўплывала як на палітычныя і эканамічныя, так і на нацыянальна-культурныя працэсы на гэтых землях у пасляпаўстанцкі перыяд іх гісторыі.

Паўстанне з'яўляецца адной з найлепей вядомых падзей XIX ст. Яго вывучэнне ўведзена ва ўсе вучэбныя праграмы курсаў па гісторыі Беларусі, што выкладаюцца ў школах і ВНУ. Аднак, нягледзячы на тое што шматлікія беларускія даследчыкі XX – пачатку XXI ст. звярталіся да падобнай тэматыкі ў сваіх працах, да гэтага часу паўнавартаснае комплекснае манаграфічнае даследаванне па гісторыі паўстання не выдадзена на тэрыторыі Беларусі. Прычыны гэтага ёсць як аб'ектыўнага, так і суб'ектыўнага характару. Даследаванне паўстання патрабуе прапрацоўкі велізарнага масіву гістарычных крыніц, што захоўваюцца ў абсалютна розных сховішчах у розных дзяржавах, таму перад гісторыкамі паўстае неабходнасць вырашэння шматлікіх арганізацыйных пытанняў пры правядзенні даследаванняў. З іншага боку складанасць і неадназначнасць самой падзеі патрабуюць асцярожнасці і карэктнасці ў падыходах, ацэнках, фармулёўках і высновах, асабліва якія тычыцца ўплыву паўстання на нацыятворчыя працэсы, станаўленне тых ці іншых ідэалагічных сістэм ці ролі ў гэтых падзеях розных дзеячаў.

150-гадовы юбілей паўстання, які ў Беларусі адзначаецца і ў колах навуковай грамадскасці, выклікаў цэлую хвалю навуковых публікацый [1], канферэнцый, дыскусій і іншых форм праяўлення цікавасці да гэтай падзеі. На працягу 2013 г. толькі ў г. Мінску адбылося некалькі канферэнцый і публічных дыскусій, спецыяльна прысвечаных праблемам гісторыі і даследавання паўстання [2]. Яшчэ адна канферэнцыя адбылася ў г. Гродна [3]. Пры гэтым варта адзначыць, што толькі за

---

[1] Агляд навуковых прац айчынных гісторыкаў за перыяд да 2013 г. тут не праводзіцца з той прычыны, што сёлета ён ужо быў праведзены Аленай Фірыновіч [гл.: Фірыновіч А.Э. Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў. – Мінск: Беларуская навука, 2013. – С. 6–32].

[2] Канферэнцыя «Польскае шляхецкае паўстанне 1863 года. Погляд на падзеі праз 150 гадоў» (г. Мінск, 20 студзеня 2013); навукова-практычная канферэнцыя «Паўстанне 1863 г. на Беларусі і яго значэнне для Беларусі» (г. Мінск, 23 сакавіка 2013 г.) (да моманту правядзення канферэнцыі быў выдадзены зборнік яе матэрыялаў: Паўстанне 1863 г. на Беларусі і Кастусь Каліноўскі: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (Менск, 23 сакавіка 2013 г.) / [пад рэд. А.Я. Тараса]. – Рыга: Інстытут беларускай гісторыі і культуры, 2013. – 238 с.); V Польска-беларуская гістарычная канферэнцыя «Да 150-годдзя паўстання 1863–1864 гг.» (г. Мінск, 19–20 верасня 2013 г.); міжнародная навуковая канферэнцыя «Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне: гісторыя і памяць (г. Мінск, 17–18 кастрычніка 2013 г.); публічная дыскусія «Кастусь Каліноўскі і паўстанне 1863–1864 гадоў: канфлікт інтэрпрэтацый 150 гадоў пасля» ў межах II Міжнароднай канферэнцыі Інстытута «Палітычная сфера» «Аднаўленне Гісторыі: памяць і грамадства ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе» (г. Мінск, 3 траўня 2013 г.).

[3] Міжнародная навукова-папулярная канферэнцыя «Паўстанне 1863 года на Гарадзеншчыне: у навуковых даследаваннях і памяці народаў» (г. Гродна, 25–26 траўня 2013 г.).

адзін 2013-ы год былі выдадзены некалькі кніг па гісторыі паўстання (у ранейшы перыяд падобныя кнігі ў Беларусі не выходзілі гадамі і нават дзесяцігоддзямі): манаграфія Алены Фірыновіч [4], навукова-папулярны нарыс Дзмітрыя Матвейчыка [5], краязнаўчыя працы Івана Будніка [6], Зміцера Хаценчыка і Дзяніса Канецкага [7]. У айчыннай навуковай і навукова-папулярнай літаратуры з'явілася немалая колькасць артыкулаў, прысвечаных розным аспектам гісторыі паўстання. Сярод іх вылучаюцца публікацыі па гісторыі паўстання на пэўных тэрыторыях [8], дзейнасці пэўных асоб у паўстанні [9], а таксама (асабліва ў краязнаўчых выданнях, але не толькі) матэрыялы пра мемарыяльныя помнікі паўстання [10] і гістарычную памяць у Беларусі пра паўстанне ў цэлым [11]. Апошні накірунак прац выражаны найлепей, як гэта паказваюць праграмы праведзеных канферэнцый, дзе часам большую частку складалі даклады, так ці інакш прысвечаныя даследаванням па гістарыяграфіі паўстання. У юбілейны год была звернута ўвага на працы вядомых гісторыкаў ці публіцыстаў, выдадзеныя раней [12]. Яшчэ большай папулярызацыі паўстання

[4] Фірыновіч А.Э. Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў. – Мінск: Беларуская навука, 2013. – 315 с.

[5] Матвейчык Д.Ч. Паўстанне 1863–1864 гадоў у Беларусі: Нарыс баявых дзеянняў. – Мінск: Медысонт, 2013. – 122 с.: іл.

[6] Буднік І.Ф. Да падзеяў 1863–1864 гг. на Гарадзеншчыне. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2013. – 107 с.: іл., партр., карты.

[7] Хаценчык З.А., Канецкі Дз.В. Падзеі паўстання 1863 г. на Вілейшчыне: гістарычныя нарысы. – Мінск: Кнігазбор, 2013. – 67 с.: іл., партр., карты.

[8] Карпович О.В. Рейд отряда Романа Рогинского по Беларуси зимой 1863 года // Вестник Полоцкого государственного университета. – 2013. – № 1. – С. 37–41; Яго ж. Состав и деятельность повстанческих организаций 1863 г. в Витебской губернии // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2013. – С. 62–65; Лаўрэш Л.Л. Паўстанне 1863 г. на Лідчыне // Лідскі летапісец. – 2013. – № 1. – С. 40–58; Sulik A.F. Powstanie Styczniowe na Wołyniu // Echa Polesia: Kwartalnik Polaków na Polesiu. – 2013. – № 1(37). – S. 26–32; і інш.

[9] [Асіноўскі С.М.] Инсургенты // Архівы і справаводства: навукова-практычны ілюстраваны часопіс. – 2013. – № 3. – С. 146–156; Чаропка В. Выкананы абавязак Антона Трусава // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 3. – С. 19–28; Яго ж. Юзаф Каліноўскі: Шлях да святасці // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 5. – С. 32–41; № 6. – С. 28–38; і інш.

[10] Память о восстании: рассказывают фотографии / [фотографии подготовлены Еленой Третьяк] // Архівы і справаводства: навукова-практычны ілюстраваны часопіс. – 2013. – № 2. – С. 115–120; Jaroszewicz A. Pamiętajmy o Powstaniu // Echa Polesia: Kwartalnik Polaków na Polesiu. – 2013. – № 1(37). – S. 16–20; Paniszewa H. Szlakiem Traugutta po Polesiu // Тамсама. – S. 2–15; Żłobin E. Niechaj Polska zna, jakich synów ma: Rok 1863 na Pińszczyźnie // Тамсама. – S. 21–25; і інш.

[11] Зеленковский И. Историческая память белорусов о польском восстании 1863 года в свете борьбы символов и понятий национальной самоидентификации // Новая Немига литературная: литературно-художественный журнал. – 2013. – № 2. – С. 200–208; Тарас А.Е. Восстание 1863-1864 гг. на белорусских землях. К 150-летию восстания // Деды: дайджест публикаций о белорусской истории. – 2013. – № 11. – С. 63–81; Унучак А.У. 1963 год: як у БССР адзначалася 100-годдзе паўстання 1863–1864 гг. і 125-годдзе з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 5. – С. 6–15; і інш.

[12] Кісялёў Г. Смак беларусчыны / уклад. Л. Кісялёвай, прадмова У. Арлова. – Мінск: Лімарыус, 2013. – 496 с.; Маскоўская ўлада на Літве, 1863–1869: далейшы працяг "Чорнай кнігі" аўтара "Аповесці пра Гражыну": [да 150-годдзя паўстання 1863 г.] / пераклад з польскай мовы Віктара Хурсіка. – Мінск: Віктар Хурсік, 2013. – 413 с.: іл., табл., карта.

спрыяюць шматлікія публікацыі пра грамадскія мерапрыемствы, звязаныя з яго тэматыкай — прэзентацыі кніг, мастацкія і музейныя выставы, падрыхтаваныя экскурсіі і да т.п. [13] Тут жа варта згадаць пра дыскусіі, якія вядуцца навукоўцамі ці публіцыстамі пра разнастайныя аспекты паўстання на старонках перыядычных выданняў, прычым значная частка гэтых публікацый прадстаўлена ва ўсеагульнай сетцы Internet.

Нават павярхоўны агляд паказвае, наколькі існуе вялікая цікавасць у беларускім грамадстве да гісторыі паўстання. Аднак варта канстатаваць, што шмат якія навуковыя працы маюць тэматычныя прабелы, няпоўнасці і нярэдкія фактылагічныя памылкі (напрыклад, полацкага гісторыка Яўгена Глазырына ці вышэй згаданыя артыкулы Алега Карповіча). Прычына гэтага ў немалой ступені крыецца ў вузкасці крыніцавай базы, што выкарыстана ў даследаваннях. Для шматлікіх навукоўцаў архіўныя крыніцы па гісторыі паўстання застаюцца невядомымі альбо малавядомымі, што прымушае іх звяртацца да ўжо апублікаваных зборнікаў дакументаў, мемуараў і інш. Аднак услед за гэтым яны часта трапляюць у палон няпоўнасцяў, характэрных для зборнікаў дакументаў, ці суб’ектывізму, уласцівага для эгадакументаў (мемуараў, эпісталярыі, публіцыстычных і літаратурных твораў і г.д.). На вырашэнне акрэсленай праблемы айчыннай гістарыяграфіі ў значнай ступені і накіраваны гэты зборнік.

* * *

Выданне дакументальных матэрыялаў [14] па гісторыі паўстання на тэрыторыі Беларусі мае дастаткова даўнюю, але не вельмі пастаянную традыцыю. Публікацыя зборнікаў дакументаў праводзілася эпізадычна, не ствараючы адзіную паслядоўную лінію. Першыя мэтанакіраваныя публікацыі вялікай колькасці падобных крыніц былі ажыццёўлены яшчэ ў часы Расійскай імперыі. Храналагічна першым з’яўляецца зборнік распараджэнняў віленскага генерал-губернатара Мікалая Мураўёва за 1863–1864 гг., выдадзены ў 1866 г. (год смерці Мураўёва) [15]. У ім дакументы (цыркуляры, загады, інструкцыі і інш.) структураваны паводле прадметна-храналагічнага прынцыпу, а прадметныя катэгорыі пададзены ў алфавітным парадку. Падобны спосаб складання ўскладняе пошук у ім неабходных дакументаў. Тым больш, што прынцып вызначэння катэгорый застаецца незразумелым. Напрыклад, зборнік змяшчае раздзел «Рыбная лоўля», а раздзел «Амністыя» адсутнічае, яго ж ролю выконвае ў пэўнай ступені раздзел «Тыя, што добраахвотна з’яўляюцца з мяцяжа» (рус. — «Добровольно являющиеся из мятежа»). Да негатыўных момантаў варта таксама аднесці публікацыю большасці дакументаў у скарочаным выглядзе, а яшчэ часткі — толькі ў межах назвы дакумента і даты. Тым не менш гэта найбольш

[13] Гл., напрыклад: Весялуха М. Яшчэ раз пра паўстанне // Літаратура і мастацтва. – № 36(4734). – 13 верасня 1863 г. – С. 12; Янушкевіч Я.Я. Вобразы-дакументы // Мастацтва. – 2013. – № 6. – С. 8–9.

[14] У гэтым зборніку не праводзіцца агляд выдадзеных і нявыдадзеных мемуараў па гісторыі паўстання ў сувязі з тым, што гэта – асобны від крыніц, які мае сваю моцную спецыфіку, абумоўленую асаблівасцямі стварэння і зместу.

[15] [Муравьев М.Н.]. Сборник распоряжений Михаила Николаевича Муравьева по усмирению польского мятежа в Северо-Западных губерниях 1863–1864 / сост. Н. Цылов. – Вильна: Типография А.К. Киркора, 1866. – 383 с.

поўны збор падобнага віду дакументаў па гісторыі паўстання ў Беларусі да цяперашняга часу.

50-гадовы юбілей паўстання даў імпульс да публікацыі чарговых збораў дакументаў. Расійскім гісторыкам і захавальнікам Віленскага публічнага музея старажытнасцяў Аляксандрам Мілавідавым у 1913–1915 гг. быў ажыццёўлены праект па публікацыі дакументаў пераважна з фондаў Віленскага генерал-губернатарства, Віленскай публічнай бібліятэкі і Мураўёўскага музея ў г. Вільні. У выніку ў шостай кнізе выдання «Виленский временник» было апублікавана каля 650 дакументаў, створаных разнастайнымі расійскімі дзяржаўнымі органамі пры падаўленні паўстання (рапарты, данясенні, паведамленні і інш.) [16]. Нягледзячы на аднабаковую падачу звестак пра паўстанне з пункту гледжання прадстаўнікоў расійскай адміністрацыі, выдадзены зборнік увёў у навуковы ўжытак значную колькасць факталагічнага матэрыялу для гістарычных даследаванняў і гэтай каштоўнасці не страціў да сённяшняга дня.

У міжваенны перыяд дакументальныя крыніцы па гісторыі паўстання ў Беларусі публікаваліся як у БССР, так і ў ІІ Рэчы Паспалітай. У Мінску тэматыка паўстання плённа вывучалася супрацоўнікамі Інстытута беларускай культуры Янам Віткоўскім, Сяргеем Цытовічам і іншымі. У выніку, апрача некалькіх выдадзеных манаграфій і артыкулаў, у 1927 г. выйшаў зборнік дакументаў «1863 год на Міншчыне» [17]. У ім апублікаваны скапіраваныя Я. Віткоўскім у фондзе ІІІ Аддзялення імператарскай канцылярыі 116 дакументаў, якія тычыліся непасрэдна Мінскай губерні. Гэта пераважна службовая перапіска расійскіх цывільных і ваенных чыноўнікаў за перыяд з 23 студзеня 1863 г. па 1 жніўня 1867 г. — данясенні, рапарты, прашэнні, распараджэнні і г.д. У сувязі з тым, што фонд Мінскай следчай камісіі (НГАБ. – Ф. 1418) захаваўся фрагментарна, немалую каштоўнасць маюць тры спісы асоб, што знаходзіліся пад следствам у камісіі ў 1863 г. Яшчэ некалькі дакументаў змешчаны ў дадатку. У цэлым зборнік увёў у навуковы ўжытак вялікую колькасць крыніц, якія тычацца гісторыі паўстання ў Беларусі.

Немалы ўклад у публікацыю дакументальных крыніц па гісторыі паўстання ўнёс другі том зборніка «Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі», падрыхтаванага Інстытутам гісторыі Акадэміі навук БССР [18]. VII раздзел, які займае ў томе 90 старонак, мае назву «Беларусь у гады паўстання 1863 г.». У ім апублікаваны 93 дакументы, якія пераважна захоўваліся ў копіях у архіве Інстытута гісторыі АН БССР. У сувязі з тым, што зборнік разлічваўся не толькі на прафесіяналаў-навукоўцаў, але і на выкладчыкаў і навучэнцаў, археаграфічны бок публікацыі ў ім выражаны дастаткова слаба. Загалоўкі многіх дакументаў былі складзены некарэктна, месцазнаходжаннем дакументаў указваўся менавіта архіў Інстытута гісторыі, дзе

---

[16] Виленский временник / основатель и редактор А.Н. Харузин. – Кн. 6: Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию в пределах Северо-Западного края. В 2 ч. / сост. А.И. Миловидов. – Ч. 1: Переписка по политическим делам гражданского управления с 1 января 1862 г. по май 1863 г. – Вильна: Губернская типография, 1913; Ч. 2: Переписка по военным действиям с 10 января 1863 г. по 7-е января 1864 г. – Вильна: Губернская типография, 1915.

[17] Rok 1863 na Mińszczyźnie – 1863 год на Меншчыне / zebr. i opr. J. Witkowski, O. Janiewicz i Lp. Lech. – Mińsk: Nakładem Instytutu Kultury Białoruskiej, 1927. – 216 s.

[18] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2 (1772–1903 гг.) / пад рэд. Н.М. Нікольскага [і інш.]. – Мінск: Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1940. – 939 с.

захоўваліся копіі, а не архівасховішча, адкуль гэтыя дакументы капіраваліся. Шматлікія дакументы апублікаваны толькі ва ўрыўках, вытрымках і да т.п., пры гэтым апушчаныя часткі ніякім чынам не растлумачаны. Урэшце, зборнік атрымаўся выразна палітызаваны. Напрыклад, пра папярэдняе пакаленне даследчыкаў і археографаў (Ігнатоўскага, Віткоўскага і інш.), некаторыя з якіх былі на той час рэпрэсіраваныя і нават расстраляныя, пісалася: *«Польскія агенты, беларускія нацыянал-фашысты, імкнуліся паказаць, што нібы беларускі народ, у прыватнасці беларускае сялянства, паўстала сумесна з польскімі элементамі насельніцтва Беларусі супроць рускага ўрада і за паўстанцкі польскі ўрад. Такая пастаноўка пытання, як сведчаць публікуемыя тут новыя дакументы, з'яўляецца тэндэнцыйнай фальсіфікацыяй гістарычнай сапраўднасці. Дакументы VII раздзела павінны дапамагчы совецкім гісторыкам разабрацца ў гэтым пытанні і намеціць правільны падыход для яго вырашэння»* [19]. Усё гэта, аднак, не пазбаўляе каштоўнасці зборніка, які ўвёў у навуковы ўжытак вялікую колькасць факталагічнага матэрыялу па гісторыі паўстання.

У міжваеннай Польшчы, дзе паўстанне на дзяржаўным узроўні з'яўлялася адной з найбольш шанаваных падзей нацыянальна-вызваленчай барацьбы, таксама адбывалася публікацыя дакументальных крыніц па яго гісторыі. У гэты час пад рэдакцыяй Вацлава Студніцкага апублікаваны спіс асоб, якім за ўдзел у паўстанні быў вынесены смяротны прысуд на тэрыторыі Віленскай вайсковай акругі з пачатку паўстання да 1 кастрычніка 1864 г., з фондаў Часовага палявога аўдытарыята ў Вільні [20]. Дакумент папярэджаны аб'ёмнай прадмовай, якая складаецца з заканадаўчых дакументаў, што тычыліся паўстання, і аўтарскіх тэкстаў пра некаторыя яго бакі. Моцна зніжае каштоўнасць гэтай крыніцы публікацыя яе не на мове арыгіналу (рускай), а ў перакладзе на польскую, што выклікае адсутнасць археаграфічнай апрацоўкі тэксту. Аднак, з іншага боку, дакумент забяспечаны аўтарскімі каментарыямі і біяграфічнымі даведкамі пра згаданых у дакуменце паўстанцаў, часам дастаткова аб'ёмнымі — да некалькіх старонак тэксту на 1 асобу.

У пасляваенны перыяд моцны ўздым цікавасці да паўстання назіраўся напярэдадні і падчас 100-гадовага юбілею гэтай падзеі, што ў сваю чаргу стымулявала зварот да крыніц, у першую чаргу архіўных, і з'яўленне пэўнай колькасці навуковых аглядаў і аналізаў разнастайных комплексаў дакументаў ці апублікаваных матэрыялаў [21].

Менавіта ў адзначаны час быў ажыццёўлены найбольш маштабны міжнародны праект публікацыі дакументальных крыніц па гісторыі паўстання на тэрыторыях былой Рэчы Паспалітай, у т.л. і Беларусі. У 1957 г. Акадэмія навук СССР і Польская акадэмія навук падпісалі пагадненне аб навуковым супрацоўніцтве, у адпаведнасці з якім была створана польска-савецкая камісія для падрыхтоўкі і выдання зборнікаў дакументаў і матэрыялаў серыі «Паўстанне 1863 года: Дакументы і матэрыялы». З гэтай серыі 2 зборнікі змясцілі крыніцы непасрэдна па гісторыі паўстання ў Бела-

[19] Тамсама. – С. IX. Захавана граматыка арыгіналу.

[20] Rok 1863: Wyroki śmierci / Red.: Wacław Studnicki. – Wilno: Nakł. i druk Ludwika Chomińskiego, 1923. – 122 s. (Wileńskie źródła archiwalne).

[21] Больш падрабязна пра гэта гл.: Фірыновіч А.Э. Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы… – С. 20–21.

русі — «Рэвалюцыйны ўздым у Літве і Беларусі ў 1861–1862 гг.» [22], дзе апублікавана вялікая колькасць дакументаў па гісторыі так званага «маніфестацыйнага» і сялянскага руху, якія папярэднічалі ўзброенаму выступленню, і «Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863–1864 гг.» [23]. Сотні дакументаў, апублікаваных у зборніках, значна ўзбагацілі фактычнае насычэнне даследаванняў больш позніх гісторыкаў. Пры гэтым каштоўнымі з'яўляюцца не толькі самі дакументы, але і аб'ёмныя каментарыі, якімі яны дапоўнены. Вялікай заслугай праекта з'яўляецца археаграфічная апрацоўка дакументаў у адпаведнасці са спецыяльна распрацаванай Генадзем Кісялёвым інструкцыяй («памяткай») [24], якая ўзятая за аснову пры апрацоўцы дакументаў гэтага зборніка.

Пасля рэалізацыі такога маштабнага праекта і заканчэння юбілею цікавасць да публікацыі дакументальных крыніц па гісторыі паўстання ў Беларусі істотна знізілася. Гісторыкі 70–80-х гг. у большай ступені сканцэнтраваліся на прапрацоўцы ўжо вядомых (апублікаваных ці неапублікаваных) комплексаў крыніц і напісанні на іх базе сваіх навуковых прац. Адзінкавыя дакументальныя крыніцы, якія публікаваліся ў гэты час, не аказвалі істотнага ўплыву па пашырэнне ўведзенага ў навуковы ўжытак фактычнага матэрыялу.

З набыццём незалежнасці Рэспублікі Беларусь паўстала пытанне пра перагляд у айчыннай гістарыяграфічнай традыцыі шмат якіх ідэйных установак, якія панавалі ў савецкі час, што ў сваю чаргу ізноў выклікала патрэбу звароту да вядомых і выяўлення новых гістарычных крыніц. У немалой ступені гэта тычылася і распрацоўкі праблематыкі паўстання, аднак навуковыя публікацыі дакументаў па яго гісторыі мелі эпізадычны характар.

У 1999 г. выйшаў у свет падрыхтаваны Генадзем Кісялёвым зборнік, прысвечаны спадчыне Канстанціна Каліноўскага [25]. Сярод іншага ў ім апублікаваны некаторыя матэрыялы следчых і судовых спраў (пратаколы допытаў Каліноўскага, яго запіскі на следстве і інш.), а таксама дакументы Літоўскага правінцыйнага камітэта (загады, маніфесты і да т.п.), якія тычацца і тэрыторыі Беларусі (некаторыя змешчаныя ў зборніку дакументы ўжо публікаваліся раней).

У 2001 г. Віктар Хурсік апублікаваў некалькі спісаў асоб, сасланых за падтрымку паўстання, з фондаў НГАБ [26]. Аднак гэтую публікацыю, пазбаўленую археаграфічнага падыходу пры падрыхтоўцы і з эмацыянальнымі назвай і прадмовай, варта аднесці хутчэй да публіцыстычных, чым да ўласна навуковых.

Адзіны падрыхтаваны непасрэдна архівістамі зборнік дакументаў па гісторыі паўстання быў выпушчаны Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі ў

[22] Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг.: документы и материалы. – М.: Наука, 1964. – 707 с.

[23] Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864 гг.: Сб. документов / [АН СССР, Ин-т славяноведения и др. – М.; Вроцлав: Наука, 1965. – 587 с.

[24] Шумейко М.Ф. Из истории подготовки международных публикаций (Методические рекомендации по археографической обработке документов серии сборников «Восстание 1863 г.») // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 11. – Мінск: БелНДІДАС, 2010. – С. 273–291.

[25] Каліноўскі К. За нашую вольнасць: Творы, дакументы / Уклад., прадм., паслясл., пер. і камент. Г. Кісялёва. – Мн.: Міжнар. фонд "Бел. кнігазбор", 1999. – 459 с., [2] л. іл. – (Беларускі кнігазбор. Серыя 2, Гісторыка-літаратурныя помнікі).

[26] Хурсік В.У. Трагедыя белай гвардыі: Бел. дваране ў паўстанні 1863–1864 гг.: Гіст. нарыс і спісы / Віктар Хурсік. – Мн.: Пейто, 2001. – 130, [1] с.

г. Гродна (далей — НГАБ у г. Гродна) у 2006 г.[27]. У ім апублікаваны 100 дакументаў з фондаў архіва адзінай відавой прыналежнасці — гэта паказанні розных асоб, якія даваліся расійскім чыноўнікам і органам падчас правядзення следчых мерапрыемстваў. Аднак успрыняццю матэрыялаў зборніка ў пэўнай ступені перашкаджаюць некаторыя асаблівасці археаграфічнай апрацоўкі дакументаў. Пры іх публікацыі складальнікамі быў абраны так званы «дыпламатычны прыём» з наступнай аргументацыяй: *«Выбар гэтага прыёму перадачы тэксту дакументаў абумоўлены тым, што дакументы дзевятнаццатага стагоддзя набылі ўжо старажытнасць, характэрную для больш ранніх эпох. Апрача таго перадача тэксту дыпламатычным прыёмам дазваляе захаваць першапачатковасць дакумента, за выключэннем абрысу літар, перадае дух эпохі, у якой яны ўзніклі, і таму гэты зборнік будзе ўяўляць цікавасць для лінгвістаў, у пэўнай ступені, палеографаў і інш.»*[28]. Апрача таго, зборнік пазбаўлены каментарыяў да зместу дакументаў, што тым больш актуальна пры публікацыі такога суб'ектыўнага віду крыніц, як паказанні, лакалізацыі падзей у адпаведнасці з сучасным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам, біяграфічных звестак пра згаданых асоб. Не на карысць зборніка гаворыць таксама і няякасны друк, пры якім у некаторых выпадках нават выпадаюць спецыяльныя сімвалы і словы застаюцца з прабеламі. Аднак, нягледзячы на спрэчнае абгрунтаванне археаграфічнага прыёму і ўсе астатнія хібы, зборнік з'яўляецца да гэтага часу адзінай спробай вырашэння праблемы масавага ўвядзення ў навуковы ўжытак тэкстаў дакументаў па гісторыі паўстання з беларускіх архіваў часоў незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Вялікую каштоўнасць для ўвядзення ў навуковы ўжытак матэрыялаў з айчынных архівасховішчаў мае згаданая вышэй манаграфія Алены Фірыновіч, у якой у якасці дадатку змешчаны пералікі выяўленых спраў і дакументаў. У ёй змешчаны пералік 469 спраў з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей — НГАБ) і 166 — з фондаў НГАБ у г. Гродна[29]. Такім спосабам праблема выкарыстання тэкстаў дакументаў хаця і не вырашаецца, аднак для даследчыкаў істотна аблягчаецца іх пошук.

* * *

Нельга сказаць, што крыніцы з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі заставаліся па-за ўвагай беларускіх гісторыкаў. Наадварот, даследчыкі як раней, так і цяпер звяртаюцца да іх пры правядзенні сваіх навуковых даследаванняў. Акрамя А. Фірыновіч, дакументы з НГАБ выкарыстаны для напісання прац Зінаідай Антановіч, Вольгай Гарбачовай, Яўгенам Глазырыным, Алегам Карповічам, Аляксандрам Лашкевічам, Аленай Серак, Валянцінай Шаўкапляс, Валянцінай Яноўскай (Грыгор'евай) і іншымі сучаснымі айчыннымі і замежнымі даследчыкамі. Аднак аналіз апублікаваных у Беларусі навуковых прац паказвае недастатковасць выкарыстання ў іх дакументаў з НГАБ, асабліва пры параўнанні з колькасцю наяўных у архіве. Дастаткова прывесці наступны прыклад. Матэрыялы з НГАБ былі выкарыстаны пры падрыхтоўцы згаданага вышэй зборніка дакументаў «Паўстанне ў Літве і Беларусі

[27] Повстанческое движение в Гродненской губернии 1863–1864 гг.: сб. документов / подг. Т.Ю. Афанасьева [и др.]; редкол. Д.В. Карев (отв. ред.) [и др.]. – Брест: Академия, 2006. – 397 с.

[28] Тамсама. – С. 19.

[29] Фірыновіч А.Э. Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы… – С. 109–285.

1863–1864 гг.». Мінская, Магілёўская і Віцебская губерні прадстаўлены ў зборніку адпаведнымі раздзеламі з 56-ю дакументамі агулам, аднак дакументаў з Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР (папярэднік НГАБ) апублікавана толькі 12 (4 у раздзеле па Мінскай губерні, 5 — па Магілёўскай і 3 — па Віцебскай). Раздзелы па гэтых губернях сфарміраваны пераважна з дакументаў Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Літоўскай ССР (далей — ЦДГА ЛітССР) (у цяперашні час — Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў). Яшчэ невялікая колькасць дакументаў з Мінска была выкарыстана для складання каментарыяў, аднак без публікацыі іх тэксту. Для параўнання — дакументаў з НГАБ у г. Гродна (у той час — Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР (Гродна)) у зборніку апублікавана 37.

У якасці доказу недастатковасці ўжывання крыніц з НГАБ падчас 100-гадовага юбілею паўстання магчыма прывесці яшчэ адзін прыклад. У манаграфіі Анатоля Смірнова [30], якая да гэтага часу застаецца адным з найбольш грунтоўных комплексных даследаванняў па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі і Літве, матэрыялы з Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР (у той час размяшчаўся ў г. Магілёве) і Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці (г. Мінск) увогуле не выкарыстаны, а апісанне дзейнасці паўстанцкіх атрадаў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях базіруецца пераважна на крыніцах з ЦДГА ЛітССР (г. Вільня) і Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі (г. Масква).

Усё гэта ўказвае на недастатковую прапрацоўку фондаў НГАБ на прадмет выяўлення крыніц па гісторыі паўстання 1863–1864 гг., што застаецца актуальным (хаця ўжо ў меншай ступені) да цяперашняга часу.

На сённяшні дзень у фондах НГАБ выяўлена каля 3 тысяч спраў, якія ў той ці іншай ступені тычацца гісторыі паўстання альбо яго прамых наступстваў. Варта адразу адзначыць, што за рэдкім выключэннем дакументы з гэтых спраў былі створаны расійскімі дзяржаўнымі органамі, і таму ў першую чаргу ў іх адлюстравана палітыка расійскіх улад па падаўленні выступлення і правядзенні рэпрэсій у адносінах да яго ўдзельнікаў. Сярод такіх органаў варта вылучыць камісіі, якія займаліся правядзеннем следства па справах паўстанцаў. У НГАБ захоўваюцца асобныя фонды дзвюх следчых камісій Мінскай губерні — у гарадах Мінску (ф. 1418) і Слуцку (ф. 1524); адной — Віцебскай — у г. Віцебску (ф. 3046); і чатырох у Магілёўскай — у гарадах Магілёў (ф. 3257), Орша (ф. 3255), Чэрыкаў (ф. 3366) і Горкі (ф. 3286). Гэтыя фонды захаваліся фрагментарна. Самы вялікі з іх — Магілёўскай следчай камісіі — уключае толькі 65 спраў, а агульная колькасць спраў у іх — 118. Найбольш цікавай групай матэрыялаў у гэтых фондах з'яўляюцца спісы паўстанцаў альбо абвінавачаных ва ўдзеле ці падтрымцы паўстання, багатыя біяграфічнымі звесткамі. Асобна варта згадаць пра матэрыялы Мінскага паліцэйскага суда, якія захаваліся ў фондзе Мінскага павятовага суда (ф. 159). Крыху менш за 30 спраў (з № 6672 па № 6699) змяшчаюць каштоўныя дакументы па гісторыі «маніфестацыйнага» руху ў Мінскай губерні.

Наступную групу фондаў, цікавых для даследчыкаў паўстання, складаюць фонды ваенных начальнікаў — часовых ваенных губернатараў Мінскай (ф. 296) і Магілёўскай (ф. 3256) губерняў, павятовых начальнікаў Пінскага (ф. 1521), Слуцкага

[30] Смирнов А.Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1963. – 391 с.

(ф. 1525), Дрысенскага (ф. 2601), Веліжскага і Суражскага (ф. 2569) паветаў, ваенных начальнікаў другога (ф. 1528) і трэцяга (ф. 1527) станаў Мінскага павета. Як правіла, гэтыя фонды таксама з'яўляюцца нешматлікімі, колькасць спраў у іх не перавышае дваццаці. Выключэнне складаюць толькі фонды часовых ваенных губернатараў Мінскай (204 справы) і Магілёўскай (69 спраў) губерняў. Гэтыя фонды ўключаюць матэрыялы аб дзейнасці саміх ваенных начальнікаў: цыркуляры, распараджэнні, загады, рапарты і г.д. Тут жа змяшчаюцца ў вялікай колькасці справы аб абвінавачванні і прысуджэнні асоб да розных відаў пакарання за ўдзел і падтрымку паўстання.

Найбольшая колькасць спраў па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. захоўваецца ў «вялікіх» фондах — губернскіх праўленняў (Мінскае — ф. 295, Віцебскае — ф. 1416, Магілёўскае — ф. 2003), упраўленняў дзяржаўных маёмасцяў (гл. ніжэй) і канцылярый губернатараў (мінскага — ф. 295, віцебскага — ф. 1430, магілёўскага — ф. 2001). Напрыклад, другі вопіс фонду канцылярыі магілёўскага цывільнага губернатара (каля 200 спраў) прысвечаны выключна паўстанню, пераважна — канфіскацыі маёмасці яго ўдзельнікаў. Матэрыялы з «вялікіх» фондаў дазваляюць прасачыць царскую палітыку ў Беларусі падчас паўстання ў адносінах да розных груп насельніцтва (аднадворцаў, шляхты, сялянства, старавераў і г.д.): накладанне грашовых спагнанняў і кантрыбуцый, фарміраванне вайсковых адзінак і цывільнай варты, перавод з прывілеяванага ў падатковыя саслоўі і інш.

Абавязковым пры прапрацоўцы гэтых фондаў з'яўляецца зварот увагі не толькі на матэрыялы за 1861–1866 гг., калі адбываліся мірныя і ўзброеныя выступленні і актыўныя рэпрэсіі супраць іх удзельнікаў, але і на справы канца 60–80-я гг. XIX ст., калі ў выніку некалькіх амністый шмат якія катэгорыі сасланых атрымалі пэўныя палёгкі пакарання.

Самай значнай групай спраў у «вялікіх» фондах з'яўляюцца дакументы аб маёмасці ўдзельнікаў паўстання і асоб, якія абвінавачваліся ў прыналежнасці да яго, — накладанне секвестру і забароны, правядзенне канфіскацый, продаж канфіскаваных маёнткаў, спагнанне грашовых штрафаў і да т.п. Гэта з'яўляецца натуральным вынікам таго факта, што канфіскацыі і рознага кшталту грашовыя спагнанні былі адным з галоўных сродкаў пасляпаўстанцкіх рэпрэсій.

Варта звярнуць увагу на фонд Віцебскага губернскага праўлення, у якім матэрыялы па паўстанні захоўваюцца пераважна ў трэцім, чацвёртым і шостым вопісах. Асаблівую цікавасць выклікае шосты вопіс, у які ўключана значная частка матэрыялаў, што выходзяць па-за межы трох губерняў (Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай). На працягу 1863–1864 гг. вялася перапіска паміж рознымі губернскімі праўленнямі (упраўленнямі) наконт секвестру і канфіскацыі маёмасці. Менавіта такім чынам у гэты фонд трапіла немалая колькасць спісаў, вышукных артыкулаў, копій канфірмацый і да іншых дакументаў, дзе згадваюцца тысячы асоб, што паходзілі з Ковенскай, Віленскай, Гродзенскай і Валынскай губерняў.

Справы пра секвестр і канфіскацыі маёнткаў у вялікай колькасці захоўваюцца ў фондах Мінскага (ф. 27, каля 50 спраў) і Віцебскага (ф. 2514, больш за 150 спраў) упраўленняў дзяржаўных маёмасцяў. У фондзе Магілёўскага ўпраўлення (ф. 2189) не выяўлена падобных матэрыялаў, і ўвогуле, за 60-я гг. у ім захоўваецца ўсяго некалькі спраў, што гаворыць пра фрагментарную захаванасць дакументаў гэтага ўпраўлення. У сувязі з тым, што вядзеннем спраў маёмасці паўстанцаў займаліся

менавіта ўпраўленні дзяржаўных маёмасцяў, матэрыялы пра паўстанне рэдка сустракаюцца ў фондах губернскіх казённых палат.

Пры правядзенні даследаванняў неабходна таксама выкарыстанне матэрыялаў з фондаў павятовых паліцэйскіх упраўленняў — Віцебскага (ф. 2500), Полацкага (ф. 2633), Лепельскага (ф. 2532), Суражскага (ф. 2586), Горацкага (ф. 2005), Аршанскага (ф. 2009), — у кожным з якіх налічваецца ад некалькіх да некалькіх дзясяткаў спраў, якія тычацца гісторыі паўстання. Як правіла, гэта справы аб увядзенні ваеннага становішча ў губерні і павеце, арганізацыі ваенна-павятовага ўпраўлення, пошуках удзельнікаў паўстання, секвестры і канфіскацыі іх маёмасці, зборы звестак пра арыштаваных для следчых камісій і да т.п.

Адносіны царскіх улад да каталіцкага духавенства падчас і пасля паўстання найлепш адлюстраваны ў фондзе Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі (ф. 1781). У прыватнасці, тут прасочваецца правядзенне рэпрэсіўных мерапрыемстваў супраць ксяндзоў, якія прымалі ўдзел у паўстанні, спачувалі яму альбо трапілі пад суд па падазронасці. Варта таксама заўважыць, што дакументы з гэтага фонду не дазваляюць скласці поўную карціну адносін каталіцкага духавенства да паўстання і з'яўляюцца фрагментарнымі [31]. Апрача таго, да цяперашняга часу фонд застаецца слаба прапрацаваным.

Для даследчыка паўстання на тэрыторыі Магілёўскай губерні карысным будзе зварот да фонду магілёўскага турэмнага замка (ф. 2150), дзе ўтрымлівалася вялікая колькасць удзельнікаў паўстання на працягу 1863–1865 гг. Матэрыялы фонду паказваюць складаныя ўмовы ўтрымання паўстанцаў пад вартай, змяшчаюць іх спісы, дакументы аб іх перамяшчэнні, спробах уцёкаў са зняволення і да т.п.

У НГАБ захоўваюцца таксама некалькі невялікіх фондаў, справы ў якіх тычацца выключна паўстання альбо яго наступстваў. Такімі з'яўляюцца фонды прыстава 3-га стану Горацкага павета (ф. 3288, 4 справы), паліцэйскага наглядчыка г. Копысі Магілёўскай губерні (ф. 3253, 3 справы), паліцэйскага наглядчыка 2-га стану Мінскага павета (ф. 1509, 9 спраў). З прычыны малой колькасці ўключаных у іх матэрыялаў гэтыя фонды дазваляюць скласці толькі павярхоўную ці фрагментарную карціну паўстання на зададзеных у назвах тэрыторыях.

Спіс фондаў, дзе захоўваюцца матэрыялы па паўстанні 1863–1864 гг., не абмяжоўваецца вышэй згаданымі. Адзінкавыя справы, якія не складаюць суцэльнага комплексу, трапляюцца ў некалькіх дзясятках фондаў — Ігуменскага павятовага суда (ф. 160), ігуменскага павятовага страпчага (ф. 162), Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (ф. 319), мінскага губернскага маршалка (ф. 320), Бабруйскага (ф. 609) і Барысаўскага (ф. 702) павятовых паліцэйскіх упраўленняў, Магілёўскай злучанай палаты крымінальнага і цывільнага суда (ф. 2111) і інш.

Неабходна таксама адзначыць пэўную тэрміналагічную асаблівасць назваў спраў. Шматлікія асобы, якія ў іх фігуруюць як «паўстанцы», на самой справе

[31] Выказваем падзяку кандыдату гістарычных навук дацэнту кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Зінаідзе Васільеўне Антановіч за дапамогу ў выяўленні матэрыялаў па паўстанні 1863–1864 гг. з фондаў каталіцкіх кансісторый.

ўдзельнікамі паўстання не з'яўляліся, а, як гэта вынікае з саміх спраў, толькі абвінавачваліся ці падазраваліся ў прыналежнасці да яго [32].

Такім чынам, у НГАБ захоўваецца вялікі масіў матэрыялаў па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі. Наяўныя дакументы дазваляюць асвятліць шматлікія аспекты гэтай важнай для айчыннай гістарыяграфіі праблемы. Яны абавязкова павінны быць выкарыстаны для напісання комплекснай працы манаграфічнага характару па гісторыі паўстання. Без іх ужывання вырашэнне гэтай праблемы застанецца няпоўным.

* * *

Пры складанні зборніка ні ў якім разе не ставілася задача скарыстаць усе дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. і падаць іх да ведама навуковай грамадскасці. Зрэшты, гэта і немагчыма ў межах невялікага аднатомнага зборніка. Яго мэта — увесці ў навуковы ўжытак ужо выяўленыя ў фондах архіва найбольш цікавыя паводле інфармацыйнага патэнцыялу крыніцы, якія асвятляюць самыя разнастайныя аспекты такой складанай, неадназначнай, у пэўнай ступені трагічнай гістарычнай з'явы, якой з'яўляецца паўстанне.

Адабраныя для ўключэння ў зборнік дакументы ахопліваюць храналагічныя межы больш шырокія за 1863–1864 гг. — з 1861 г., калі на землях былой Рэчы Паспалітай пачаўся перыяд так званага «маніфестацыйнага» руху, да 1870-х гг. (найбольш позні дакумент — 1876 г. (№ 223)), калі адбываўся працэс амністыі ўдзельнікаў паўстання. Тэматычна яны дазваляюць прасачыць выспяванне паўстання ў 1861–1862 гг., баявыя дзеянні на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў, мерапрыемствы расійскіх улад па задушэнні паўстання, правядзенні рэпрэсій у адносінах да яго ўдзельнікаў і змяненні ў цэлым палітычнай сітуацыі на землях Беларусі з мэтай недапушчэння падобных выступленняў у будучыні. Пададзеныя ў зборніку дакументы паказваюць сітуацыю на тых ці іншых тэрыторыях напярэдадні паўстання, стаўленне да яго розных канфесійных і сацыяльных груп насельніцтва, правядзенне працэсу амністыі ўдзельнікаў паўстання, а таксама шматлікія іншыя бакі гэтага складанага гістарычнага перыяду.

Геаграфічна дакументы ахопліваюць (за рэдкімі выключэннямі) абшар Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. Гэта з'яўляецца вынікам таго факта, што ў фондах НГАБ захоўваюцца матэрыялы, якія ствараліся менавіта на гэтых землях. Гісторыя паўстання ў іншых «беларускіх» губернях (Гродзенскай і Віленскай) у іх адлюстравана слаба, што не дазваляе правесці адбор дакументаў і па гэтых тэрыторыях.

Дакументы, змешчаныя ў зборніку, публікуюцца ўпершыню. Некаторыя з іх ужо ўжываліся беларускімі і замежнымі гісторыкамі ў навуковых працах, аднак большасць яшчэ невядома гісторыкам. Дакументы на рускай мове друкуюцца без перакладу, дакументы на польскай — з перакладам на беларускую мову. Каментарыі і

[32] Больш падрабязна агляд крыніц па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. з фондаў НГАБ гл.: Матвейчык Дз.Ч. Паўстанне 1863–1864 гг.: крыніцы з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (агульны агляд) // Архівы і справаводства. – 2013. – № 1. – С. 66–77.

патэкставыя заўвагі створаны на беларускай мове. Лакалізацыя населеных пунктаў праведзена на падставе тагачасных і сучасных даведнікаў [33].

Дакументы размешчаны паводле геаграфічна-храналагічнага прынцыпу і згрупаваны ў пяць раздзелаў, тры з іх падзелены на падраздзелы, вылучаныя асобна па кожным павеце. Нумарацыя дакументаў бесперапынная.

Першы раздзел — «Пярэдадзень паўстання» — змяшчае 11 дакументаў, якія адлюстроўваюць развіццё на тэрыторыі трох губерняў «маніфестацыйнага» руху і дзейнасць расійскіх улад па яго спыненні, правядзенні першых рэпрэсій у адносінах да апазіцыйна настроенага насельніцтва. Сярод дакументаў афіцыйнага справаводства — лісты, данясенні, рапарты вышэйшых і ніжэйшых чыноўнікаў цывільнай адміністрацыі пра спевы «забароненых гімнаў» у касцёлах, пакараннях удзельнікаў недазволеных уладамі грамадскіх мерапрыемстваў і інш. Тут жа змешчана адозва «польскай моладзі» «Да ліцвінак і русінак» — адзіны ў зборніку дакумент літаратурна-публіцыстычнага жанру, уключаны з прычыны сваёй рэдкасці.

Другі раздзел — «Віленскае генерал-губернатарства» — прадстаўлены 9-ю дакументамі пераважна адміністрацыйна-распарадчага характару, якія не ствараліся спецыяльна для трох згаданых вышэй губерняў, а дзейнічалі на іх тэрыторыях як на частцы ўсяго генерал-губернатарства.

---

[33] Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Брэсцкая вобласць: Нармат. давед. / І.А. Гапоненка, І.А. Капышоў і інш.; пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2010. – 319 с.; Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Віцебская вобласць: Нармат. давед. / І.А. Гапоненка, І.А. Капышоў і інш.; пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2009. – 669 с.; Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Гомельская вобласць: Нармат. давед. / І.А. Гапоненка, І.А. Капышоў і інш.; пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2006. – 382 с.; Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Гродзенская вобласць: Нармат. давед. / І.А. Гапоненка, І.А. Капышоў і інш.; пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2004. – 471 с.; Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Магілёўская вобласць: Нармат. давед. / І.А. Гапоненка, І.А. Капышоў і інш.; пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2007. – 407 с.; Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Мінская вобласць: Нармат. давед. / І.А. Гапоненка, І.А. Капышоў і інш.; пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2003. – 605 с.; Рапановіч Я.Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Брэсцкай вобласці / рэд. П.П. Шуба. – Мн.: Навука і тэхналогія, 1980. – 176 с.; Яго ж. Слоўнік назваў населеных пунктаў Віцебскай вобласці / рэд. П.П. Шуба. – Мн.: Навука і тэхналогія, 1977. – 504 с.; Яго ж. Слоўнік назваў населеных пунктаў Гомельскай вобласці / рэд. П.П. Шуба. – Мн.: Навука і тэхналогія, 1986. – 240 с.; Яго ж. Слоўнік назваў населеных пунктаў Гродзенскай вобласці / рэд. П.П. Шуба. – Мн.: Навука і тэхналогія, 1982. – 319 с.; Яго ж. Слоўнік назваў населеных пунктаў Магілёўскай вобласці / рэд. П.П. Шуба. – Мн.: Навука і тэхналогія, 1983. – 240 с.; Яго ж. Слоўнік назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці / рэд. П.П. Шуба. – Мн.: Навука і тэхналогія, 1981. – 360 с.; Списки населенных мест Гродненской губернии по состоянию на 1-е января 1870 г. – Б.м., б.д. [1873?]; Список волостей, обществ и селений Минской губернии на 1-е января 1870 г. – Б.м., б.г. [1873?]. – 128 с.; Список населенных мест Витебской губернии / сост. А.П. Сапунов. – Витебск: Губернская типография, 1906. – 514 с.; Список населенных мест Могилевской губернии / под ред. Г. Пожарова. – Могилев: Губернская типография, 1910. – 250 с.; Список населенных мест Минской губернии / сост. В.С. Ярмолович. – Минск: Губернская типография, 1909. – 227 с.; Список населенных мест Минской губернии в алфавитном порядке селений по каждой волости. – Минск: Губернская типография, 1912; Указатель населенным местностям Гродненской губернии, с относящимися к ним необходимыми сведениями. – Гродно: Губернская типография, 1905. – 180 с.

Трэці («Віцебская губерня»), чацвёрты («Магілёўская губерня») і пяты («Мінская губерня») раздзелы пачынаюцца з пэўнай колькасці дакументаў, якія тычацца ўсёй тэрыторыі кожнай з губерняў цалкам, пасля чаго наступныя дакументы структураваны паводле прыналежнасці апісаных у іх падзей да тых ці іншых паветаў. У падраздзелах па паветах змешчана ад аднаго («Полацкі павет», «Чавускі павет») да 14-ці («Барысаўскі павет») дакументаў, аднак звычайна іх колькасць вагаецца ў межах 4–7. З агульнай колькасці дакументаў афіцыйнага справаводства выбіваюцца толькі 2 прыватныя лісты (дак. №№ 187 і 194). Малая колькасць такога віду крыніц з'яўляецца вынікам таго, што, як правіла, у НГАБ не трапілі прыватныя архівы ўдзельнікаў паўстання ці тых, хто яго падаўляў, і, з іншага боку, найбольш цікавыя дакументы, як правіла, далучаліся да следчых і судовых спраў, якія перасылаліся на канчатковы разгляд у Часовы палявы аўдытарыят у г. Вільню, дзе і заставаліся. У цяперашні час вялікая колькасць дакументаў па гісторыі паўстання ў Беларусі захоўваецца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве.

Напрыканцы зборніка змешчаны асабовы і геаграфічны паказальнікі, спіс крыніц і літаратуры, якія былі выкарыстаны для складання зборніка і каментарыяў да яго. Іншыя крыніцавыя і бібліяграфічныя пазіцыі, у т.л. згаданыя ў прадмове, у гэты спіс не ўносіліся.

У якасці базы для археаграфічнай апрацоўкі дакументаў выкарыстана памятка [34], якая была распрацавана пад кіраўніцтвам Генадзя Кісялёва для публікацыі дакументаў у серыі «Паўстанне 1863 года: Дакументы і матэрыялы», аднак з некаторымі неістотнымі змяненнямі. На наш погляд, гэтая памятка, як спецыяльна распрацаваная для дакументаў, што маюць падобную відавую прыналежнасць і адлюстроўваюць тую ж падзею, найлепш пасуе для падрыхтоўкі гэтага зборніка. Унесеныя змяненні тычацца наступных аспектаў:

– адным з дадаткаў да памяткі ўводзіўся спіс скарачэнняў, якія ўносіліся ў тэкст дакументаў (напрыклад, в.б. – ваше благородие), у гэтым зборніку падобныя скарачэнні не выкарыстоўваюцца, як і якія-небудзь іншыя скарачэнні арыгінальнага тэксту; усе скарачэнні, якія сустракаюцца ў дакументах, раскрываюцца ў квадратных дужках, за выключэннем агульнапрынятых і ў цяперашні час: д. – деревня, г. – 1) город, 2) год; с. – село, м. – местечко; т.е. – то есть;

– у памятцы не рэкамендавалася ўжываць тэрмін «рукапіс» у легендзе пасля тэксту, у зборніку гэты тэрмін актыўна ўжываецца для вызначэння тэхнікі стварэння дакумента; пры гэтым таксама значна скарочаны пералік варыянтаў для абазначэння аўтэнтычнасці ці капійнасці дакумента;

– у памятцы не рэкамендавалася ў якасці каментарыяў да дакументаў падаваць біяграфічныя звесткі пра асоб, згаданых у дакументах, а рэкамендавалася выносіць у паказальнік імёнаў, аднак падобны спосаб не ўдалося вытрымаць нават самім складальнікам; у зборніку ж біяграфічныя звесткі пра асоб у вялікай колькасці пададзены ў каментарыях са спасылкай пераважна на дакументы НГАБ, чым таксама рэалізуецца мэта зборніка па ўвядзенні дакументаў НГАБ у навуковы ўжытак;

– у памятцы рэкамендавалася апускаць графлёную форму дакументаў (напрыклад, пратаколы допытаў), у зборніку яна захавана (гл., напрыклад, дак. № 53);

[34] Тэкст гэтай памяткі і дадаткаў да яе гл.: Шумейко М.Ф. Из истории подготовки международных публикаций… – С. 278–291.

– у памятцы рэкамендавалася недакладнасці тэксту, якія не мелі сэнсавага значэння (арфаграфічныя памылкі, апіскі і да т.п.), выпраўляць без агаворак; у зборніку гэтае правіла пакінута толькі для чарнавікоў, у арыгіналах і белавых копіях усе памылкі пазначаюцца ў пастаронкавых заўвагах;

– у памятцы рэкамендавалася колькасныя лічбы, абазначаныя словамі, перадаваць арабскімі лічбамі; у зборніку яны перадаюцца ў адпаведнасці з арыгіналам, за выключэннем камбінаванага напісання (напрыклад, «во $1^{\underline{x}}$» перадаецца як «во-первых»).

Асноўны тэкст усіх дакументаў публікуецца ў поўным аб’ёме. Выключэнні ёсць толькі ў двух дакументах (№№ 80 і 87), часткі тэкстаў якіх альбо занадта вялікія паводле іх аб’ёму для публікацыі ў падобным зборніку, альбо не тычацца паўстання. Таблічная структура некаторых дакументаў захавана. Выдзеленыя курсівам у друкаваных і падкрэсленыя ў рукапісных дакументах словы і фразы захаваны ў такім жа выглядзе і ў зборніку.

Да кожнага дакумента складзены загаловак, у які ўключаны дата і месца (калі вядомы) яго стварэння, назва яго віду, аўтар, адрасат (калі ён быў) і кароткі змест. У выпадку наяўнасці арыгінальнага загалоўка ён захоўваўся і публікаваўся пасля рэдакцыйнага загалоўка і перад асноўным тэкстам дакумента (напрыклад, дак. №№ 43, 101 і інш.). Таксама ў тэксце пакінуты аўтарскія звароты да адрасату (дак. №№ 2, 196 і інш.).

Створаная да кожнага дакумента легенда змешчана пасля дакумента. Яна ўключае пошукавыя дадзеныя (абрэвіятуру архіва, нумары фондаў, вопісаў, спраў і аркушаў), спосаб стварэння тэксту (рукапіс альбо друк; калі рукапісны дакумент напісаны на друкаваным бланку, гэта таксама пазначаецца). Калі пасля тэхнікі стварэння адсутнічаюць пазначэнні, гэта азначае, што дакумент арыгінальны; у іншых выпадках ужываюцца тэрміны «чарнавік» і «копія».

Пераважная большасць подпісаў пад дакументамі расшыфравана. У выпадку немагчымасці ідэнтыфікацыі асобы, гэта пазначаецца адпаведнай заўвагай.

Прозвішчы, якія ў рускамоўных дакументах перададзены з польскай мовы праз “рж” (напрыклад: «Вержбицкий», «Пржиборовский», «Старженский» и да т.п.), перакладзены на беларускую мову праз “р” (напрыклад: «Вярбіцкі», «Прыбароўскі», «Сторэнскі» і да т.п.)

У пастаронкавых заўвагах да дакументаў адзначаны асаблівасці яго тэксту ў арыгінале; усе ж заўвагі да зместу, звесткі пра згаданыя ў ім падзеі, асобы, мясцовасці і інш. вынесены ў паслядакументныя каментарыі. У біяграфічныя даведкі ўключаліся ў першую чаргу звесткі пра дачыненне асобы да паўстання і далейшы лёс; звесткі дапаўстанцкага перыяду падаваліся ў кароткім выглядзе. Пры лакалізацыі згаданых у дакументах населеных пунктаў указвалася іх прыналежнасць да тагачаснага і сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Назвы населеных пунктаў у каментарыі падаюцца ў сучаснай іх форме, змешчанай у згаданых вышэй даведніках. У выпадках, калі мясцовасці і асобы ідэнтыфікаваць ці лакалізаваць не ўдалося, гэта пазначаецца ў асобным каментарыі. Назвы населеных пунктаў (за выключэннем павятовых і губернскіх гарадоў, чые назвы і лакалізацыя добра вядомыя) пададзены ў падрадковых заўвагах у беларускім варыянце іх напісання. Менавіта беларускі варыянт вынесены ў геаграфічны паказальнік з лакалізацыяй пунктаў на час паўстання і паводле сучаснага адміністрацыйна-

тэрытарыяльнага падзелу. У асабовым паказальніку імёны і прозвішчы таксама пададзены ў беларускім варыянце напісання.

У асабовым і геаграфічным паказальніках спасылкі даюцца на нумар старонкі.

Напрыканцы выказваем словы падзякі дырэктару Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь Уладзіміру Адамушку, дырэктару НГАБ Дзмітрыю Яцэвічу і намесніку дырэктара НГАБ Дзянісу Лісейчыкаву за арганізацыйную дапамогу, супрацоўнікам аддзела публікацыі дакументаў НГАБ Юрыю Снапкоўскаму, Вадзіму Урублеўскаму і Міхаілу Крывіцкаму за дапамогу пры археаграфічнай апрацоўцы дакументаў, а таксама ўсім супрацоўнікам НГАБ за спагаду і падтрымку ў выданні зборніка.

*лістапад 2013 г.*

# Асабовы паказальнік


Абакановіч Павел 246, 303, 304
Абрамаў Павел 237, 240
Абуховіч Напалеон 419, 456, 457, 460
Абуховіч Оттан (Антоні) 419, 457
Абуховіч Юзаф 417
Абухоўскі, засядальнік 354
Агееў Дзяменці 252
Агінскія 53, 55
Аглоблін, фельдфебель 433
Аголін Аляксандр 58, 59, 61, 64, 69, 76, 78, 79, 128, 132, 139, 165, 177, 180, 201, 207, 210
Адамаў, селянін 168
Адамовіч Марыяна 397
Адамовіч Ян 397
Адамовіч 412
Адамовічы 396
Адынец Напалеон 375, 377
Адынец Ян 368, 369
Адынец, памешчык 183
Азоўскі, маёр 342
Азямблоўскі Зыгмунт 132
Акрэйц-Якейц Уладзіслаў, гл. Якец-Акрэйц Уладзіслаў
Акулаў Астап 163
Акулаў Іосіф 163
Акуліч Юзаф 52, 53
Акуліч-Казарын Людвік-Пётр 272
Акушка Антоні 61, 62, 63
Акушка Караліна 63
Александровіч Адам 443, 444
Александровіч Вітальд 443, 444
Александровіч Канстанцін 123, 135, 182, 183, 189
Александровіч Міхал 123, 135, 182, 183
Александровіч, вучань 402
Александровічы 444
Алендскі N., 373
Аленікаў (Аляпака) Іван 216
Аліфяровіч (Альфяровіч), дваранін 449, 450, 451, 452
Альфяровіч, гл. Аліфяровіч
Альшэўскі Аляксандр 192, 210
Альшэўскі Вінцэнт 373
Альшэўскі, надворны радца 294
Аляксандр ІІ 44, 67, 114, 171, 459, 467
Аляксандр ІІІ 148, 193
Аляксандр, вучань садоўніка 149
Аляксандр, унтэр-афіцэр 433
Аляксееў Язафат 156
Аляксееў, генерал-маёр 141, 144
Аляпака, гл. Аленікаў Іван
Аляхновіч, ксёндз 136
Аляшкевіч, аканом 368, 370
Андросік Герасім 395
Андросік Рыгор 395
Андрушкевіч Уладзіслаў 324, 327
Андрушкевічы 388
Андрэеў Антон 144
Андрэеў Іосіф 144
Андрэеў Павел 225, 226, 247
Андрэеў, селянін 158
Андрэй, селянін 122
Анісенка Іван 51, 52
Аніхімоўскі Адольф 148, 264, 265, 411
Аніхімоўскі Рафал 264
Аніхімоўскі, афіцэр 363
Анкудовіч Баляслаў 122, 130, 132, 136
Анненкаў, генерал-ад'ютант 309
Аношка Феліцыян 149, 158, 159, 160
Антановіч Юзаф 282
Анташкевіч Якаў 225, 226
Антон, сельскі стараста 143
Антонаў Михайла, гл. Прыалкоўскі Антоні
Антонаў, падпаручнік 454
Анцыпа Ільдэфонс 226, 266, 272, 273
Аравольскі Леан 209
Арахоўскі Тадэвуш 442, 443, 444
Арлоўскі Адольф 173
Арлоўскі Аляксандр 171, 173
Арлоўскія, памешчыкі 168, 170, 171
Арол, селянін 158
Арцімовіч Анзэльм 400, 401, 449, 450, 451
Арцімовіч Казімір 210
Арцімовіч Максімільян 285, 287
Арцімовіч Міхал 268, 284, 285, 286, 287, 288, 289, 290, 302
Арцішовіч (Арцішэвіч) Дамінік 285, 287, 288, 289, 290
Арцішэвіч Дамінік, гл. Арцішовіч Дамінік
Арцішэўскі Мікалай 149
Арэхаўна (Арэхаўка), в. Бабініцкай вол. Лепельскага пав., у цяперашні час – в. Нацкага с/с Полацкага р-на

Віцебскай вобл. Рэспублікі Беларусь 77, 79
Асіповіч (Восіпаў) Ігнат 217, 218
Асіповіч Казімір 456
Асіповіч Юзаф 458
Асіпоўскі Афанасій 51, 52
Аскерка Міхал 346, 347, 348, 349, 351
Аскерка Ян 307, 308, 310
Асмалоўскі Базыль 305
Асмалоўскі Сымон 305, 306
Асоска Ільдэфонс 383, 384
Асоўскі Павел 90
Астапаў Вікенці 61
Астаф'еў, паручнік 413, 414
Астахаў Павел 242
Астахаў, палкоўнік 354, 454, 459, 460, 461
Астроўскі Марцін 225, 226
Астроўскі 158, 159, 161
Асяеўскі Казімір 456
Асяндоўскі Баляслаў 168, 169, 170, 171, 173
Асяндоўскі Фелікс 168, 170, 171, 173
Асяцімская Ганна 322
Асяцімскі Альфонс 322, 324, 328
Асяцімскі Іпаліт 380
Асяцімскі Люцыян 380
Асяцімскі Рудольф 378, 379, 380
Асяцімскі Юстын 380
Асяцімскія 388
Аўдзееў Фёдар 341
Аўсяны Юзаф 136
Аўсяны Юзаф, дэкан 136
Афанасовіч Францішак-Станіслаў 465, 466, 467
Афанасьеў Парфён 341
Афанасьеў, маёр 342
Афанасьеў, селянін 99
Бабашынскі Аляксандр 248
Бабашынскі Міхал 248
Бабашынскі Ян 102, 104, 108, 109, 113
Бабок Васіль 248
Багданаў Клім 218
Багдановіч Клеафас 240, 260
Багдановіч Норберт 103, 104, 108, 109, 112
Багдановіч Фелікс 371, 373
Багдановіч Юзаф 368, 369
Багдановіч Ян 421
Багдановіч-Дварэцкі Станіслаў, гл. Дварэцкі-Багдановіч Станіслаў
Багданскі Цыпрыян 361, 381
Багданскі Ян 359, 361, 383
Багенскі Юзаф 142
Багенскі, дробны памешчык 330
Багурскі Антоні 458
Багушэвіч Тадэвуш 150, 152
Багушэвіч Ян 307, 308, 309
Багушэўскі Аляксей 118, 119
Бакшанская Марыя 424
Балвіц, гл. Бохвіц Люцыян
Барабан, селянін 144
Баравік Баляслаў 347, 348, 351
Баранаў Эдуард 175, 294, 296
Барановіч Антоні 425, 426
Бараноўскі Аляксандр 430
Бараноўскі Андрэй 284, 285, 286, 287, 288, 289, 290, 428
Бараноўскі Леанід 457
Баранцэвіч Канстанцін 456
Баранцэвіч Ксаверы 421
Баранцэвіч Стэфан 457
Бардушка Францішак 371, 373
Баркоўскі Іаахім 260, 261
Бародзіч Вітальд 404, 405
Бародзіч Ігнат 442, 443, 444, 449, 450, 452, 453
Бародзіч Юзаф 456
Барсук, памешчык 392
Барташэвіч Андрэй 461, 462
Баршчэўскі Аўгусцін 182, 185, 195
Баршчэўскі, сакратар міравога пасрэдніка 165
Баршыеўскі, лекар 455
Барысевіч, памешчык Магілёўскай губ., 301
Барысевіч, памешчык Слуцкага (?) пав., 458
Барысёнак Архіп 442, 443
Барысёнак Елістрат 443
Барысовіч Уладзіслаў 315
Баўтута, мешчанін 105
Бахаловіч Ізыдар 181
Бахаловіч Станіслаў 93, 132, 181, 182, 183, 184, 185, 194
Бачкоўскі Станіслаў 240, 241
Бачыжмальскі Леанард-Ігнат, гл. Бачызмальскі Леанард-Ігнат
Бачызмальскі (Бачыжмальскі) Леанард-Ігнат 368, 369, 371, 378, 380
Баярчык Варвара 169, 171
Беклямішаў Аляксандр 60, 76, 221, 224, 225, 226, 227, 245, 247, 259, 260, 261, 267, 270, 271, 272, 273, 274, 275, 276, 279, 281, 284, 291, 294, 297, 302, 304, 305, 307, 311, 313, 315, 316, 319,

321, 323, 336, 337, 339, 340, 341, 392, 398, 431
Беліковіч Антоні 183, 190, 191
Беліковіч Францішак 183, 190, 191
Беліновіч Тамаш 394
Бельдзюкевіч Францішак, гл. Більдзюкевіч Францішак
Бельскі Аляксандр 249, 250, 257
Беніслаўскі Зыгмунт 166, 167, 168, 170, 172
Бенядзіктовіч Аляксандр 91
Беразінскі Мікалай 282
Берасневіч Яўген 421
Бескін Лейба 217
Бескін Янкель 216, 217
Бесядоўскі, штабс-капітан 156
Більдзюкевіч (Бельдзюкевіч) Францішак 330, 331
Біршарт Антоні 163
Бітны-Шляхта Адам 252
Бітны-Шляхта Аляксандр 251
Бітны-Шляхта Вільгельм 330, 332
Бітны-Шляхта Габрыэль 249, 250, 251, 252, 253, 255, 256, 259
Бішарт (Бішаф, Бішаў, Бышаў) Карл 324, 327
Бішаў Караль, гл. Бішарт Караль
Блавачынскі (Блігачынскі) Міхал 456
Блажэвіч Адам-Ян 219
Блажэвіч Аляксандр 218
Блажэвіч Міхал 217, 218, 219
Блахін Уладзімір 268, 269, 313, 314, 315, 392, 393
Бобрык Антон 319, 320, 321, 323
Бохан Дарафей 404, 405
Бохвіц (Балвіц) Люцыян 429
Брадке, фон, Міхал 44, 45, 466, 468
Брадоўскі Юзаф 282
Браздзецкі 392
Бразінскі Мечыслаў 282
Бразінскі, чыноўнік ці дваранін 51
Бразоўская Зоф’я 246
Бразоўскі Адольф 268, 269
Бразоўскі Ксаверы 248, 250, 251, 257
Бразоўскі Францішак 246
Бразоўскі Юзаф 245
Брандт (Брант), палкоўнік 246, 260
Браніцкі, граф 446
Брастоўскі Уладзіслаў 173
Брэўд, яўрэй 390
Буген (Бугень) Бенядыкт 310
Будзіловіч Ігнат (Каткоў, Ян Піхоўскі) 111, 178, 226, 234, 237, 242, 247, 248, 249, 251, 256, 257, 262
Будзько Адэль, гл. Медунецкая Адэль
Будкевіч, гл Буткевіч Антоні
Буевіч Юзаф 240, 241
Буйван Ян 267, 268, 269, 272, 273
Буйвід Юзаф 309, 311
Буйніцкі Ян 114
Буклаўскі, мешчанін 168
Букота Лукаш 458
Букрэеў Андрэй 421
Булгак Альгерд 310
Булгак Генрык 310
Булгак Ігнат 309, 310
Булгак Оскар 310
Булгак Эдгар 310
Булгак Юзаф 310
Булгак, памешчык 307, 308, 371, 373
Булгакі, памешчыкі 311, 312
Булгарын Юзаф 268, 284, 285, 286, 288, 289, 290, 342
Булгарын, падпалкоўнік 342
Бурава Ганна 50
Бутвілоўскі Адам 115, 116
Буткевіч Антоні 168, 170, 171, 172
Буткевіч Эдвард 91
Буткевіч Юстына 91
Бутовіч Юзаф 282
Бухавецкі Станіслаў 67
Бухман Елля 442
Бучынскі Уладзіслаў 149
Быкоўскі Ян 247
Былінскі, памешчык 363
Бырташ Пётр 137
Бышаў Караль, гл. Бішарт Караль
Бядрыцкі Ігнат 131
Бядрыцкі Леапольд 208, 209
Бядрыцкі Людвік 131
Бядрыцкі Станіслаў 131
Бядрыцкі, аканом 127, 128
Бязерскі, дваранін 371
Бялевіч Казімір 145, 146
Бялінскі, паручнік 381, 382
Бяляеў, палкоўнік (падпалкоўнік) 124, 125, 338, 398
Бяляўскі Станіслаў 408, 409
Бяляўскі, палкоўнік 124, 131, 161
Вадзяніцкі, памешчык 99, 100
Важынская Ганна 328
Важынскі Апалон 319, 320
Важынскі Ян 319, 320, 324, 328
Вайткевіч Ежы 200, 202
Вайцяхоўская Багуміла 237, 238, 239, 240, 241, 244, 254

Вайцяхоўскі (Вайцяховіч) Ігнат 285, 287, 288, 290
Вайцяхоўскі Вінцэнт 237
Вайцяхоўскі Вінцэнт-Каятан 52, 53, 59, 60
Вайцяхоўскі Міхал 209
Вайцяхоўскі Ян 113, 240, 242
Вайцяхоўскі Ян, кухар 158, 159
Вайцяхоўскі Ян, чыноўнік 104, 107, 109
Вайцяхоўскі Ян, шляхціц 237, 240, 241
Вайшыцкі Ігнат 301, 302
Валадковіч, памешчык 61
Валадковіч, памешчыца 149
Валасецкі, пісар 378
Валасюк Казімір 442
Валіцкая Мацільда 365
Валіцкі Аляксандр 378, 380
Валіцкі Густаў 358, 360, 378, 380
Валіцкі Ігнат 360, 363, 365
Валовіч, памешчык 370, 371
Валодзічаў Андрэй 433
Валодзька Валерыян 242
Валодзька Уладзіслаў (Янка Каваль) 427
Валодзька Уладзіслаў 427, 440
Валодзька Эліадор 236, 237, 242
Валуеў Пётр 44, 46, 65, 67, 70, 93, 139, 140
Вальдэ, дэ, Віктар 166, 171, 172, 197
Вальдэн, дэ 186
Вальдэн, дэ, Віктар 161, 162, 166, 167, 170, 171
Вальдэн, дэ, Сільвестр 166, 170, 171, 172, 197
Вальдэн, дэ, Эдвард 166, 167, 170, 171, 172, 197
Валюк Пракоп 421
Валянцінаў Восіп 390
Вансовіч Юльян 145, 146
Ванькові Ян-Юзаф (Ляліва) 436
Варанец Адам 383, 385
Варапай Мікалай 108, 110, 114
Варывончык Антон 395
Васілеўская (народжаная ці 1 v. Маліноўская) Канстанцыя 307, 309
Васілеўская Адэль 113
Васілеўская, дзявіца 321
Васілеўскі Аляксандр Адамавіч 234, 235, 237, 238, 241, 243
Васілеўскі Аляксандр Дамінікавіч 103, 106, 107, 109, 113
Васілеўскі Раймунд 230, 231, 232, 233
Васілеўскі Ян 387
Васілеўскі, доктар 307
Васілеўскі, памешчык 321
Васіль, архіепіскап полацкі і віцебскі 141
Васіль, селянін 395
Васільеў (Васільевіч) Патап 225, 226, 247
Васільеў Андрэй 270
Васільеў Васіль 178
Васільеў Канстанцін 270
Васільеў Сымон 99
Васільеў Ян 316
Васільеў, селянін 158
Васільеў, стацкі радца 223, 225
Ваўчацкі Стэфан 369
Вахрушаў, капітан 174
Вацлаў 400, 401
Ваяводскі, паручнік 432
Ведэрмейер Мікалай 461, 462
Вейліхман, генерал-лейтэнант 428
Велігурскі Міхал, гл. Вяльгорскі Міхал
Верамей, гайненскі староста 359, 363, 365
Візгаўт Іаахім 373
Віктар, сельскі староста 366
Вількен, фон, Васіль Мікалаевіч (Вільгельм-Мікалай) 266, 318, 334, 338
Вільчынскі Ян 319, 320
Вілямоўскі, памешчык 165
Вінабэрт, вольны хлебароб 445, 446
Вінаградаў, прапаршчык 386
Вінкевіч Уладзіслаў 283
Віскоўскі Станіслаў 281
Віславух Фелікс 67
Віслоцкі Вацлаў 282
Вітгенштэйн Леў 379, 380
Віткоўскі Ігнат 264
Віттэ, фон, палкоўнік 335
Вічульскі Баляслаў 234, 235, 236, 238, 241, 244
Вішнеўскі Антоні 119
Вішнеўскі Францішак 324, 327
Войніч Цыпрыян 375, 377
Вольбэк Антоні 209
Вольскі Караль 168, 169, 170, 171, 172, 173
Воранаў, палкоўнік 408
Восіпаў Ігнат, гл. Асіповіч Ігнат
Восіпаў Павел 128
Выганоўскі Фердынанд 405
Выкоўскі (Вылкоўскі) Юзаф 315
Вырвіч Юзаф 400, 401, 449, 451
Высоцкі Юдэль 403, 404, 405
Вышамірскі Міхал 149, 150

Вышамірскі Юльян-Альбін 363, 365, 375, 376
Вэгер, дынабургскі купец 215, 216
Вэйдэ Аляксандр 145
Вэйдэ Людвік 143, 144, 145
Вэйдэ Міхал 144, 145
Вэйсэнгоф Уладзіслаў 322, 324, 328
Вэндарф (Вендараў) Браніслаў-Адам-Мікалай-Марак 454
Вэндарф (Вендараў) Браніслаў-Адам-Мікалай-Марак 455, 459
Вэндарф Адаляцэнт-Уладзіслаў-Эгіда-Адам-Матэвуш 459, 465, 467
Вялічка, начальнік інваліднай каманды 314
Вялічка, чыноўнік 73, 75
Вяльгорскі (Велігурскі) Мечыслаў 131, 171, 208
Вяльгорскі (Велігурскі) Міхал 131, 167, 171, 208
Вянслаўскія 330
Вярбіцкага Ежы 340
Вярбіцкі Аўгуст 132
Вярбіцкі Ежы 339, 341
Вярбіцкі Тэадор 274, 275, 276
Вяроўкін Уладзімір 64, 70, 71, 72, 73, 82, 84, 85, 86, 87, 88, 89, 90, 91, 92, 93, 102, 110, 117, 118, 119, 121, 138, 141, 142, 143, 150, 151, 158, 161, 164, 174, 177, 178, 179, 205, 214, 216, 263
Вярхоўскі, палкоўнік 344, 435, 436, 437
Вярыга Арцём 103, 104, 106, 107, 108, 109, 110, 111
Вярыга Валерыян Ігнатавіч 237, 239, 241, 242, 244
Вярыга Валерыян Янавіч 103, 104, 106, 108, 109, 112
Вярыга Юзаф 182, 185, 196
Вярыга, прыслужнік ксяндза 115
Вярыга, станавы прыстаў 129
Вярыга, шляхціц 169
Вярыгі 398
Вячаслоў Мікалай 291, 292
Гавароўскі (Гаворскі) Рыгор 408, 409
Гаворка, чыноўнік 56, 412
Гаворскі Рыгор, гл. Гавароўскі Рыгор
Гадзельскі Марак 324, 328
Гадуноў, штабс-капітан 165
Гадэцкі, ксёндз 443
Газдзіцкі Норберт 319, 320, 330
Гайдамовіч Ян 387
Гайлевіч Юзаф 173
Галанбеўская Марыя 115
Галаўня Анеля 447, 448, 452
Галаўня Канстанцін-Конрад 447, 450, 453
Галаўня Ружа 411, 412, 453
Галаўня Фяліцыя 453
Галер Іван 69, 70
Галер, фон, Міхал 123
Галіоф Кацярына 119
Галіоф Мікалай 119, 120, 121, 153, 154
Галіоф Ян 119, 120, 121, 155
Галіцкі Нікадзім 402, 446, 448, 449, 451
Галіцкі Нікадзім 452
Галіцкі Станіслаў 400, 401, 402, 403, 446, 447, 448, 449, 450, 451, 452
Галкевіч Юзаф 230, 232, 233
Галкоўскі, святар 316
Галынскі Антоні 209
Гальгоер Аляксандр 420, 422
Галякевіч Адам 395
Ганіпроўскі, памешчык 61
Гараднічын Сяргей 98, 99, 100, 101
Гаражанскі, памешчык 145
Гарайнаў Аляксей 136, 137, 138
Гарбатоўскі, падпаручнік 439, 440
Гарбачэўскі Ігнат-Каміл 465, 466, 467
Гарбачэўскі Феліцыян 465, 466, 467, 468
Гарбачэўскі, лепельскі гараднічы 151
Гарбачэўскі, сасланы ў Сібір 355
Гардзялкоўскі Андрэй 330, 331
Гародка Францішак 282
Гартынскі Канстанцін 60
Гарцінг, стацкі радца 434
Гарэла Рыгор 421
Гатоўка Емяльян 368, 371
Гаўрыіл, лакей 368
Гаўрылаў Міхаіл 100
Гаціцкі Баляслаў 282
Гедройць-Юрага Віктар 185, 186, 197
Гейштар Якуб 58, 63, 188, 233
Гелваноўскі Станіслаў 234, 237, 238, 241, 243
Гелла, капітан 101
Генюш Баляслаў 301, 302
Генюш Юльян 123, 127, 128, 129, 130, 133, 134, 135
Герасімовіч, засядальнік 386
Герачынскі Андрэй 148

Герман Эдмунд (Эдвард) 417, 419
Германс, палкоўнік 151, 163
Гетрашэвіч, штабс-капітан 101
Гільдэбрант, фон, Карл 113
Гінтаўт Канстанцін 371, 372
Гінтэр, каронны засядальнік 297
Гіршын Яфім 318
Главацкі, аканом 276, 277
Гладкоўскі Аляксандр 283
Глазка Міхал 400, 401, 449, 451
Гласка Антоні 183, 190
Гласка Ксаверы 58, 59, 122, 123, 124, 127, 131, 132, 136
Гласка Траян 183, 191
Глінскі Францішак 61, 62
Глыбоўскі, дзьякан 404
Глябовіч Адольф 440, 441
Глябовіч Юзаф 434
Гнаінскі (Міткевіч-Гнаінскі) Пётр 424, 425
Гнусевіч (Гнясевіч) Адам 421, 424
Гнясевіч Адам, гл. Гнусевіч Адам
Гогенберг Гайнула 226
Годны Дзям'ян 433
Гоёс, фон , капітан-лейтэнант 151
Гольдзінг Шмуйла 178
Горват Аляксандр 405
Горыцын, аўдытар 223
Грабніцкі Адольф 96
Грабніцкі Оттан 140, 141, 150
Грабоўскі Адольф 96, 97, 98
Грабоўскі, капітан 420
Граковіч Міхал 359, 360, 361, 363, 365
Грамека, старшыня Віцебскай следчай камісіі 101, 102
Грасіцёнак Рыгор 141
Гратулевіч Апалінары 183, 189
Грахольскі Фелікс 275, 276, 313
Грахольскі Францішак 168, 170, 171, 172
Грахольскі, арандатар 238
Грудзінскі Адам 142
Грудзінскі Аляксандр 408, 409
Грудзінскі, калежскі сакратар 424
Грушвіцкі Рудольф 408
Грыгаровіч Баляслаў 458
Грыгаровіч Эвеліна 424
Грыгор'ева Акуліна 294
Грыгор'еў Лук'ян 106, 107, 108, 110
Грыгор'еў Маркел 226
Грыгор'еў, маёр 394
Грыневіч Іаахім 115, 116
Грыневіч Тамаш 314, 316
Грынеўскі Стэфан 102, 104, 108, 109, 112
Грынцэвіч (Грыцэвіч), палкоўнік 177
Грыцкевіч Каятан 421
Грыцэнка Каятан 406, 407
Грэнгаген, гл. Гэссэльбэрг
Губар Юзаф 456
Гумоўскі Антоні 161, 162
Гумоўскі Антоні 163
Гумоўскі Мечыслаў 161, 162, 163
Гумоўскі Напалеон 161, 162, 163
Гуптар Стэфан 373
Гурко Антоні 239, 246, 247, 249, 250, 251, 256
Гурко Юльян 249, 257, 260, 261
Гутароўскі, обер-сакратар 68
Гутэн-Чапскі, фон, Эмерык 363, 366
Гуцька Антон 426
Гуцька Антося (Настасся) 426, 427
Гуцька Восіп 426
Гуцька Мацвей 426, 427
Гэссэльбэрг (Грэнгаген), падпалкоўнік 342
Гяроднік Ігнат 136
Гяртовіч, ксёндз 308
Гяцэвіч, аканом 200, 201
Дабашынскі Рыгор (Ежы) 421, 424
Дабкевіч Канстанцін 428, 429
Дабравольскі Ігнат 52, 53
Дабравольскі Юзаф 371, 374
Дабравольскі Ягор 402, 403
Дабравольскі, аканом 275, 277
Даброўскі 383
Дабрыкевіч Міхал 236, 237, 238, 239, 240, 241, 242, 244
Давідовіч (Давыдовіч) Якуб 416
Давідовіч (Давыдовіч) Ян 416
Давыдовіч Якуб, гл. Давідовіч Якуб
Давыдовіч Ян, гл. Давідовіч Ян
Далецкі Ян 340, 341
Далькевіч (Дашкевіч) Юльян 417, 419, 456
Дамарацкі Войцех 281
Дамбоўскі 182, 185
Дамброва Антоні 375, 376
Дамброва Антоні 376
Дамброва Баляслаў 376
Дамброва Уладзіслаў 376
Дамброўская Зоф'я 405
Дамброўскі Юзаф 142

Дамброўскі, палкоўнік 382, 383, 389
Дамейка Аляксандр 55, 56, 58
Дамейкі 53, 55
Дамухоўскі Пётр 359, 361, 368, 369, 371, 372, 375, 376, 378, 379, 381, 383
Данілаў Сцяпан 200, 201
Данілаў, штабс-капітан 156
Дарафееў Пётр 270
Даўгарукаў Васіль 181, 420
Даўгова-Сабураў Сяргей 277, 278
Дашкевіч Адольф 457
Дашкевіч Юльян, гл. Далькевіч Юльян
Дварэцкі Канстанцін 303
Дварэцкі-Багдановіч Station Станіслаў 324, 325
Дзеражынскі Юзаф 249, 256
Дзердзяеўскі Эдмунд 282
Дзержаноўскі Станіслаў 314
Дзінец Якаў 318
Дзмітрыеў, капітан 362, 363, 364
Дзмітрыеў, падпалкоўнік 46
Дзядзіцкі Міхал 358, 360
Дзяконскі, палкоўнік 438
Дзялынскі, ксёндз 466, 468
Дзяменцьеў, селянін 144
Дзярынскі Геранім 330, 332
Дзярынскі Ян 454
Дзярынскі, аканом 250
Длатоўскі Эразм 78, 79, 80, 85, 86, 93, 96, 128, 132, 140, 141, 151, 176, 177, 204, 205, 207, 209
Длужнеўскі Юзаф 137, 182, 184, 185, 186, 197
Дмахоўскі (Дмухоўскі) Генрык 140, 141, 152, 153, 154, 155, 156, 161, 163, 195, 383, 384, 385, 386, 387, 389
Дмухоўскі Генрык, гл. Дмахоўскі Генрык
Добыш Ілля 450
Донстун, штабс-капітан 454
Доўмант Генрык 383, 385
Доўнар-Запольскі Эдвард (Эдмунд, Эразм) 427, 428, 430
Драган, чыноўнік ці дваранін 51
Драгапула, падпалкоўнік 454, 455, 459
Другавіна Бенядзікт 182, 183, 185, 194
Другавіна Францішак 183, 190
Другавіна Ян 93, 149, 181, 185, 187, 188, 189, 190, 191, 192, 193, 194, 195, 196, 197, 198, 199
Дружына Вінцэнта 193
Дрэваед Гальяш 358, 360
Дрэваед Зыгмунт 358, 360, 375
Дрэваед Юзаф 358, 360, 375, 377
Дрэваед Ян 360
Дрэлінг Ігнат 129, 130
Дрэлінг Маргарыта 129
Дубатоўка Аляксей 404, 405
Дубяня Стэфан 299
Дудар Цімафей 230, 232, 233
Дукальскі Канстанцін 123, 127, 128, 130
Дульскі Кірыл 432
Дыбоўскі Павел 351
Дыка Уладзіслаў 157
Дыманскі, дваранін 230
Дырмант (Дырманд) Канстанцін 102, 104, 105, 108, 109, 112
Дышлеўскі Юзаф 398, 399
Дышлеўскі, паліцмайстар 252
Дышлеўскі, памешчык 319, 330
Дышынскі Карп 383, 384
Ёдка 368, 370
Ёдка-Наркевіч 370
Емяльянаў Сцяпан 226
Ермаловіч (Ярмаловіч) Пётр 324, 327
Есымон (Есьман), памешчык 369
Есьман (Эсьман) Аўрэлія 362, 371
Есьман Генрык 355, 356, 357
Есьман (Эсьман) Людвік-Сільвестр 356
Есьман (Эсьман) Людвік-Сільвестр 357
Есьман (Эсьман) Пётр-Эварыст 355, 356, 357
Есьман (Эсьман) Рудольф 355, 356
Есьман (Эсьман) Рудольф 356, 357
Есьман (Эсьман) Філіпіна 357
Есьман, памешчык 360
Еўраінаў Мікалай 179, 180
Жабінскі Міхал 368
Жаброўская, памешчыца 408
Жаброўскі Апалінары 360, 362
Жаброўскі Ігнат 360, 362
Жаброўскі Канстанцін (Костка, Навіцкі) 123, 135, 320, 324, 326, 389
Жаброўскі Мікалай 408
Жаброўскія 388
Жакевіч, асэсар 316
Жаландкоўскі, гімназіст 403
Жалігоўская Марыя 424, 425
Жалігоўская Юлія 425
Жалігоўскі Мікалай 425

Жалігоўскі Часлаў-
Калікст 425
Жаркевіч Ванда 50, 51
Жарноўскі Ян (Януш)
124, 125, 137
Жаўнерчык Андрэй 395
Жаўняроўскі, штабс-
капітан 171
Жвірздоўскі Геранім
421
Жоўтак, камандзір
атрада 157, 320, 323,
327, 332, 373, 376
Жудра Баляслаў 449
Жудра Казімір 117, 118
Жук Аляксандр 185
Жук Антоні 185, 186,
198
Жук, пісар 168, 171, 172
Жукоўскі Аляксандр
307, 310
Жукоўскі Ян-Алаізі 289,
336
Жукоўскі-Прус
Баляслаў, гл. Прус-
Жукоўскі Баляслаў
Жураўскі, польскі
ўраджэнец 277
Жыдовічы 398
Жынка Раман 421
Жэўрат, ксёндз 324
Забалоцкі Васіль 327,
342, 343, 344, 345, 346,
352, 353, 355, 388, 389,
397, 398, 404, 406, 407,
413, 414, 422, 423, 434,
435, 436, 445, 446, 461,
463, 464
Забароўскі Ігнат 461,
462
Забела, памешчык 98
Заблоцкі Ануфры 282
Завадскі Яўген 102, 104,
108, 109, 113
Завадскі, памешчык 429
Загаранская-Кісель
Марыя, гл. Кісель-
Загаранская Марыя
Загаранская-Ксіель
Тэкля, гл. Кісель-
Загаранская Тэкля
Загурскі Генрык 321
Заёнскі, сакратар 229
Зайкоўскі Генрык 136
Зайкоўскі Ян 136
Заленскі Аляксандр 183,
185, 196
Заленскі, памочнік
ксяндза 308
Залеўскі, гімназіст 403
Замайскі Гектар 402,
403
Замайскі Казімір 402,
403
Замкоў, прапаршчык
443
Занковіч Ваўрынец 249,
250, 251, 252, 253, 255,
256, 259
Занковіч Тамаш 253
Занковіч Юстын 251
Занковіч Ян 253, 255
Запольскі Людвік 282
Запольскі Міхал 284
Запольскі-Доўнар
Эдвард (Эдмунд,
Эразм), гл. Доўнар-
Запольскі Эдвард
(Эдмунд, Эразм)
Заранскі Пётр 217
Зарэмба Аляксандр 165,
166
Зарэцкі, памешчык 324
Зас Мікалай 248
Захар, агароднік 294,
295
Захараў Аксенці 154,
156
Захараў Раман 421, 422,
423
Захаркевіч Юзаф 143,
144, 145
Захарэвічы, шляхта 129
Заянчкоўскі Марцін
330, 390, 391
Заяц Марцін,
гл. Заянчкоўскі
Марцін
Звяждоўскі Людвік
(Тапор) 226, 237, 242,
267, 268, 271, 281, 286,
290, 298, 316, 338, 339
Зданоўская Фокія 114
Зданоўскі Ян 115
Здраеўскі Пётр 324, 328
Зелянеўскі Казімір 282
Зенгбуш,
фон, Аляксандр 53
Зігерн-Корн, фон,
памешчык 210
Зігерн-Корн, фон,
Уладзіслаў 132
Зімаровіч Павел 390,
391
Зіскін Лейба 366, 367
Злата, полацкая яўрэйка
185
Знарок Карп 383, 384
Зыгмунт Дрэваед 377
Зэге-Мантэйфель
Рышард,
гл. Мантэйфель-Зэге
Рышард
Зябіцкі Юзаф 132
Зялёнка Васіль 158, 159,
160, 161
Зялінскі Ларыян 342,
345, 346, 398
Зялкеўскі 400, 401
Зяльдовіч Элля 392, 393
Зямцоў Шлёма 151, 152
Зяньковіч Францішак
248
Іванова Антаніна 108
Іваноў Васіль 454
Іваноў Восіп 225, 226
Іваноў Леан 156
Іваноў Нічыпар 270
Іваноў Пётр 169
Іваноў Пракоп 260, 261
Іваноў Раман 270
Іваноў Харытон 285
Іваноў Цярэнці 103
Іваноў, аўдытар 102
Іваноў, обер-аўдытар
289
Іваноўская, памешчыца
358, 363
Іваноўскі Францішак
386
Іваноўскі Эдмунд 421
Іваноўскі, доктар 186,
196
Івашкевіч, службоўца
371
Івашэўскі, памешчык
330
Ігельштром, палкоўнік
342, 438

Ігнацьеў Рыгор 245
Ігнацьеў, паручнік 102
Ізбіцкі Ян 248
Ізмайловіч Ігнат 249, 257
Ілініч Гаўрыла 309, 311
Ісакава Яўгенія 62
Іскендзікаў Марцін 103
Іцка, перавозчык 149
Кабак Тэадор 457
Кабалкін Вульф 390
Кабылянскі Уладзіслаў 440, 441
Кавалеўская Зоф'я 409
Кавалеўскі Аляксандр 86, 135, 142, 146, 171, 173, 177, 205, 214
Кавалеўскі Юзаф 298, 302
Кавалеўскі, паручнік 408
Каваль Янка, гл. Валодзька Уладзіслаў
Кавальніцкая Алена 464
Кавельмахер Вацлаў 458
Кавецкі Антоні 185, 188, 194
Кавецкі Тамаш 458
Кажэўнікаў Андрэй 82, 343, 354, 355, 362, 366, 371, 375, 378, 381, 382, 383, 385, 394, 396, 414, 415, 417, 424, 431, 440, 442, 454, 463
Кажэўнікаў Фёдар 303
Казак Георг 282
Казарын Іпаліт 158, 159, 160, 161, 271
Казёл (Казлоў) Васіль 330
Казела Вінцэнт, гл. Козел-Паклеўскі Вінцэнт
Казлоўскі Анастазі 189, 234, 237, 238, 239, 240, 241, 242, 243
Казлоўскі Антоні 283
Казлоўскі Дамінік 400, 401, 402, 449, 451
Казубоўскі Антоні 297, 298, 334
Каламацьяна Ксенафонт 223, 224
Калецкая Юзэфа 61, 62
Калецкі Ігнат 103
Каліноўскі Вінцэнт-Канстанцін 188, 347, 349
Калкоўскі Аляксандр 202
Кальніцкі, падпаручнік 432
Камарніцкі, дваранін ці чыноўнік 51
Камароўскі Рышард 324, 325
Камароўскі Ян 426
Камароўскі, пісар 277
Каменскі, памешчык 334
Камінскі Антоні 237, 239, 241, 244
Камінскі Ян 359, 361
Камоцкі, афіцэр 363
Кампоўскі Вацлаў 58, 59
Канановіч, уладальніца кватэры 402
Канапацкі Базыль 379
Канапацкі Баляслаў 368, 370
Канапацкі Стэфан 152, 155
Кандратаў Міхал 270
Кандратовіч Вінцэнт 129, 130
Кандратовіч, пісар 375
Кандрацьеў Павел 100
Кандыба, памешчык 408
Канецкі Ігнат 104, 105, 108, 109, 113
Канстанцін, прыслужнік 129
Капілінскі Караль 456
Каплінскі Эдмунд-Рыгор 324, 327
